ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чацвер 10 лютага 1938 г., № 8 (350).

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ДАСТОЙНА СУСТРЭЦЬ ВЫДАТНЫ ЮБІЛЕЙ

Краіна Советаў рыхтуецца да выдатнага юбілея. 23 лютага нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту спаўняецца 20 год.

20 год расце і мацнее любімае дзецішча совецкага народа—армія і флот нашай соцыялістычнай краіны. Совецкі народ ганарыцца гераічным мінулым сваёй Чырвонай Арміі і свайго Чырвонага Флота. Народжаныя ў агні грамадзянскай вайны, армія і флот на чале з В. І. Леніным і І. В. Сталіным, вылучыўшы з свайго складу выдатных пролетарскіх палкаводцаў — Фрунзе, Варашылава, Будзённага, Блюхера, Чапаева, Шчорса, Катоўскага і шмат іншых — разграміла полчышчы інтэрвентаў, белыя банды, абараніла рэспубліку Советаў.

Совецкі Саюз з першага дня Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі змагаецца за мір, паслядоўна праводзіць палітыку міру. І на варце інтарэсаў мірнай палітыкі Совецкай краіны, на варце заваёў рэволюцыі стаіць наша армія і наш флот. Але зараз, як ніколі раней, наблізілася пагроза вайны. Фашысцкія падпальшчыкі вайны няспынна пасылаюць пагрозы па адрасу Совецкага Саюза, рыхтуюць напад на нашу соцыялістычную краіну. І совецкі народ павінен увесь час найбольшую ўвагу аддаваць таму, каб мець напагатове магутную Чырвоную Армію і лепшы ў свеце Ваенна-Марскі Флот, якія здольны ў кожную хвіліну стаць на абарону вялікай радзімы, яе соцыялістычных заваёў.

«Няхай кожная арганізацыя Совецкай Расіі не перастае ставіць на першым месцы пытанне аб арміі»—гаварыў у 1918 годзе В. І. Ленін. Гэтае ўказанне вялікага правадыра ніколькі не страціла свайго значэння і сёння.

І сёння клопат аб умацаванні абароназдольнасці Совецкага Саюза, умацаванні Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота—пярвейшы клопат совецкага народа. Наш народ і наша армія—адзіны.

Сваіх лепшых сыноў пасылае совецкі народ у сваю горача любімую армію. Чырвоная Армія—выдатная школа для нашай моладзі. Чырвоная Армія выхоўвае моладзь палітычна, загартоўвае фізічна, дае ўсебаковыя веды і вырашчвае байцоў-герояў, якімі па праву ганарыцца ўся Совецкая краіна.

Таму так горача, з такой любоўю спявае ў сваіх песнях наш народ аб слаўнай Чырвонай Арміі і яе палкаводцах.

Зараз увесь народ вялікага Совецкага Саюза рыхтуецца дастойна сустрэць і адзначыць слаўнае дваццацігоддзе.

Работнікі трох ордэнаносных тэатраў Масквы—Дзяржаўнага Вялікага Акадэмічнага тэатра Саюза ССР, Дзяржаўнага Малага акадэмічнага тэатра Саюза ССР і Маскоўскага Мастацкага акадэмічнага тэатра Саюза ССР імя М. Горкага звярнуліся да ўсіх работнікаў мастацтваў СССР з заклікам разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да юбілея Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, з заклікам дастойна сустрэць і адзначыць выдатнае свята.

Работнікі ўсіх галін мастацтваў БССР — творчыя калектывы тэатраў, работнікі кіно, мастакі і музыканты горача адгукнуліся на гэты заклік. Распрацаваны дэталёвыя планы падрыхтоўкі да свята і адзначэння яго, узяты абавязацельствы па ўзмацненню сувязі з часцямі Чырвонай Арміі, па дапамозе чырвонаармейскай самадзейнасці, па разгортванню сярод работнікаў мастацтва абароннай работы. Разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва між творчымі калектывамі работнікаў мастацтваў на лепшую творчую падрыхтоўку да юбілея і лепшую арганізацыю культшэфскай работы ў часцях Чырвонай Арміі.

Мастацтва Совецкага Саюза адзначае юбілей Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота радам выдатных абаронных твораў. Варта, напрыклад, указаць, што лепшыя мастацкія фільмы совецкай кінематаграфіі — «Чапаеў», «Мы з Кранштата», «Апошняя ноч», «Валачаеўскія дні» — з'яўляюцца абароннымі фільмамі.

Але работнікі мастацтваў БССР у вялікім даўгу перад нашай Чырвонай Арміяй і Ваенна-Марскім Флотам. Праўда, за апошні час беларуская кінематаграфія стварыла выдатны абаронны фільм «Балтыйцы». Нашы мастакі далі некалькі новых работ на абаронныя тэмы. Кампазітары напісалі рад песень аб Чырвонай Арміі і палкаводцу яе К. Е. Варашылаве. Але гэтым абмяжоўвацца нельга. Гэта—толькі пачатак надзвычай важнай работы. Асабліва адстаюць нашы тэатры. На сцэнах тэатраў БССР яшчэ няма высокамастацкіх спектакляў аб гераічнай Чырвонай Арміі, яе людзях, яе палкаводцах.

Тое, што абаронныя тэмы ўсё-ж не сталі цэнтральнымі ў творчасці работнікаў мастацтваў БССР, тое, што на нашай сцэне няма новых п'ес аб Чырвонай Арміі,—недаравальна. І асабліва недаравальна гэта работнікам мастацтваў Совецкай Беларусі, пагранічнай рэспублікі, заходняга фарпоста вялікага Совецкага Саюза. Гэта трэба зразумець усім работнікам мастацтваў і Упраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР.

1938 год—год юбілея, год 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота—павінен стаць годам стварэння выдатнейшых твораў аб нашай абароназдольнасці, аб нашых героях-пагранічніках, аб нашай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце. Стварыць яркія карціны, захапляючыя кінофільмы, масавыя песні і маршы, паказаць хвалюючыя спектаклі аб Чырвонай Арміі, аб нашай абароннай магутнасці—вось задача работнікаў усіх галін мастацтваў БССР.

Літаратура народаў Совецкага Саюза за апошні час узбагацілася радам новых буйных мастацкіх твораў на абаронную тэму. Толькі ў апошнія дні совецкі чытач атрымаў выдатную аповесць Аляксея Талстога «Хлеб». Гэта кніга аб гераічным змаганні Чырвонай Арміі з белымі бандамі, аб тым, як арганізоўваў Чырвоную Армію вялікі палкаводзец і кіраўнік яе, натхніцель перамог І. В. Сталін, аб выдатных пролетарскіх палкаводцах К. Е. Варашылаве і С. М. Будзённым.

Наша партыя, наш совецкі народ патрабуюць ад пісьменнікаў БССР напружанай творчай працы па стварэнню твораў аб Чырвонай Арміі, абаронных мастацкіх твораў. І Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР павінен з'явіцца арганізатарам гэтай працы. Пісьменнікі Совецкай Беларусі павінны жыць аднымі пачуццямі, аднымі думкамі з нашымі мужнымі пагранічнікамі, слаўнымі байцамі Чырвонай Арміі і ствараць творы, якія-б захаплялі і выхоўвалі чытача ў духу бязмежнай адданасці партыі Леніна—Сталіна, нашай радзіме. Гэта пярвейшы абавязак кожнага пісьменніка — совецкага патрыёта.

Байцы Чырвонай Арміі чакаюць паходных песень, хвалюючых вершаў, таленавітых твораў прозы. Тэатры і драмгурткі чакаюць новых п'ес, услаўляючых веліч і гераізм Чырвонай Арміі.

І 1938 год—год юбілея, год 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — павінен стаць годам стварэння гэтых твораў абароннай літаратуры, якіх патрабуе наша радзіма. Пагранічная Совецкая Беларусь павінна мець багатую абаронную мастацкую літаратуру. Як байцы Чырвонай Арміі напорыста і дасканала авалодваюць ваеннай тэхнікай, так совецкія пісьменнікі павінны ауладаць абароннай тэматыкай. І ў гэтым, 1938 годзе яны павінны ўзбагаціць абаронны ўчастак нашай літаратуры радам таленавітых твораў аб мінулых і сучасных днях Чырвонай Арміі. Гэтыя творы дапамогуць Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту ў аўладанні баявой тэхнікай, дапамогуць трапна і рашуча біць ворага, узброяць нашу армію яшчэ адной магутнай сілай—натхняючым мастацкім словам. Стварэнне такіх твораў—абавязак кожнага пісьменніка.



«Дазор» (барэльеф). Работа па дрэву чырвонаармейца тав. Шчэнкова.

Фота-рэпрадукцыя І. Каплінскага.

СПРАВАЗДАЧА ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

6 лютага лепшыя калектывы чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці Менскага гарнізона давалі справаздачу аб сваёй творчасці. Гэта своеасаблівая мастацкая справаздача вялася праз радыёстанцыю імя Комінтэрна перад нябачана вялікай аудыторыяй—мільёнамі працоўных.

Байцы, камандзіры, баявыя падругі камандзіраў, перш чым сабрацца ля мікрафона ў калоннай зале менскага Дома Чырвонай Арміі, доўга і ўпарта працавалі над сабой, рыхтуючы ў падарунак магутнай Чырвонай Арміі і совецкай грамадскасці сваю мастацкую праграму.

Самадзейнасць байцоў, камандзіраў і іх жонак — баявых падруг ёсць адзін з элементаў штодзённай палітыка-асветніцкай работы ў Чырвонай Арміі, накіраванай на ўмацаванне яе баявой магутнасці і выхаванне асабовага складу. Гэта абавязвае актывістаў мастацкай самадзейнасці сур'ёзна і дзелавіта адносіцца да сваёй творчасці.

— Ля мікрафона чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць.

Перадача вядзецца з калоннай залы менскага Дома Чырвонай Арміі імя першага маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава, — сказаў дыктар.

І загучала ў магутнай народнай мелодыі, у радасных напевах беларускага народа калгасная песня аб вялікім Сталіне. А за гэтай песняй, упэўнена і любоўна выкананай, паліліся беларускія народныя мелодыі. Народныя песні ордэнаноснай Совецкай Беларусі, у выкананні лепшых спевакоў любімай народам Чырвонай Арміі, слухаў увесь свет. Магутныя хвалі станцыі імя Комінтэрна неслі яе далёка за межы, праз моры і акіяны, праз хрыбты высокіх гор.

Спявала магутная Чырвоная Армія.

Вось бадзёрыя калгасныя прыпеўкі. Што можна з імі параўнаць! Што можа быць больш жыццёрадасным, сцвярджаючым радасць і шчасце нашых сонечных дзён!

Гэта выступіў хор курсантаў Менскага Ваеннага Вучылішча, хор будучых камандзіраў несакрушальнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Спяваюць салісты. Ваенны тэхнік авіяцыі тав. Дзенісаў праспяваў песні аб любімым Сталіне, аб луганскім слесары — наркоме Варашылаве. Сваю мастацкую работу ён прысвяціў XX гадавіне Чырвонай Арміі. Яго выступленні ведае ўвесь гарнізон. А перад мікрафонам ён здаў экзамен майстра-спевака.

Выступаюць кавалерысты-гарманісты, выконваюць баявыя песні і маршы гераічных дзён паходаў Чырвонай Арміі: «Далёкаўсходнюю» Кніпера, «Коннаармейскую», а потым чырвонаармейскую-плясавую. Спяваюць гармонікі, мякка ллюць мелодыю баяны, роўна акампаніруюць басы, гучыць бубен і ўторыць яму срэбрам калакольчыкаў традыцыйны конна-страявы бунчук.

Хор баявых падруг камандзіраў налічвае ў сваім складзе 50 чалавек. Яго песні прысвечаны магутнасці і несакрушальнасці Чырвонай Арміі, аплоту соцыялістычнай краіны, пышна квітнеючай пад сузор'ем Сталінскай Канстытуцыі. Праграма хора вялікая. Тут і рамантычныя песні гераічнага мінулага Чырвонай Арміі, песня аб легендарным Чапаеве, аб комсамольцах, аб баяністу, забітым куляй, аб магутных самалётах ваенна-паветранага флота.

Зацейнікі частушачнага жанра тт. Кулікаў і Астаф'еў па-саратаўску, з пераборамі гармоніка, спяваюць волжскія частушкі. Яны спяваюць не аб старой Волзе, што стагнала, — не, іх песня аб новай Волзе, што ў сталіцу—Маскву прышла, ды так прышла, што Жыгулі ад здзіўлення ахнулі.

Праграма ішла 55 мінут. А калі закончылася, усе напружана чакалі, што скажа Масква. Ведалі — Масква перахвальваць не будзе, яна дасць сур'ёзную, строгую ацэнку, ацэніць па заслугах. І Масква сказала: «Вельмі добра!».



Прыезд І. В. Сталіна ў Першую Конную армію ў снежні 1919 года. З карціны мастака Авілава.

Янка Купала

ТО НЕ РЫЦАРЫ КАЗАК...

То не рыцары казак
З князем шлі на войны, —
Гэта шлі ваякі
Арміі чырвонай.
Пралятала слава
Па лясах, па полю,
Як свайму народу
Здабывалі волю.

***

Не нявольнікаў скутых
Толпы шлі па ночы, —
То ўставаў да працы
Вольны люд рабочы.
З дымаў, з папялішчаў
Выйшаў у свет са славай,
Ворагаў зніштожыў,
Збудаваў дзяржаву.

***

То не вікінгі сагаў
Выплылі ў паходы, —
То плывуць па хвалях
Нашы цеплаходы.
Плаваюць, бы тыя
Лебедзі ў вазёрах,
Па спюдзёных, цёплых
Акіянах-морах.

***

То не сокалы-птушкі
Вымыкалі ў далі. —
Гэта самалёты
Нашы вылятаці.
Аблятаюць неба
Лётам небывалым,
Дзе людская думка
Векі не сягала.

***

То не новая зорка
Узышла на ўсходзе. —
Гэта Сталін шчасце
Засяе ў народзе.
Засяе рукою
Дбалаю магутнай.
Толькі чутны песні,
Радасць толькі чутна!

Грузія, Цхалтуба.

М. Дзядзюля

ХУСЦІНКА

Лікавала вёска і спявала,
Лікавала і спявала вёска —
Комсамольцаў у службу выпраўляла
У чырвонае праслаўленые войска.
І шырокай, роўнаю дарогай
Між палёў праводзіла дзяўчына
Любага свайго і дарагога
Вартаваць совецкую краіну.
Нечакана наступіларостань.
Развіталася дзяўчына з мілым,
Ў гонар неразлучнага сяброўства
Белую хусцінку падарыла,
Падарыла любаму на памяць
Ў знак дзявочай, незабыўнай дружбы.
І пайшоў тады з таварышамі
Ганаровую ён несці службу.
Прамінулі, праляцелі леты,
Прашумелі ў палях калоссем.
Прыляцела ціха, непрыкметна
Залатая, радасная восень.
Праслужылі комсамольцы ўчывна,
І цяпер вярталіся дадому.
Стройная, прыгожая дзяўчына
Выбегла насустрач дарагому.
Сустракала радаснаю песняй
Комсамольцаў маладых, шчаслівых,
А дзяўчыну сустракалі весткай
Горкаю, бязраднаснай, тужлівай.
Яе любы вартаваў аддана
Родную вялікую краіну,
І, прабіты куляю паганай,
Ад варожае рукі загінуў.
Куляю прабітую хусцінку,
Белую хусцінку перадалі.
Паліліся горкія слязінкі,
Горка, горка дзеўчына рыдала
Белаю хусцінкаю прабітай
Гора свайго слёзы выцірала,
І змагацца з ворагам-бандытам
Імем дарагога прысягала.

Алесь Жаўрук

СЛЕСАР З ЛУГАНСКА, ЖАЛЕЗНЫ НАРКОМ

Слаўных падзей не знікаюць сляды—
Жыць ім у сотнях легенд!..
Помнім, палалі наўкол гарады,
Вёскі знікалі нашчэнт.

Помнім, плылі з чатырох бакоў
Хмары да нашых застаў —
Хто нас, шахцёраў і батракоў,
У бойку тады паднімаў?

Хто праз ашчэранасць чорных акопаў
Вёў нас драпежніка біць?—
Піцер, Бярэзіна, Перакоп —
Гэтых імён не забыць.

Быццам жывыя, ўзнікаюць гады,
Саланчаковы прасцяг...
З кім мы к Прымор'ю прынеслі тады
Славай абвеяны сцяг,

Каб крэсавалі пшаніцай палі,
Плодам налітым — сады,
Каб падрасталі героі-сыны
І маладзелі дзяды?

Ты — легендарны любімец палкоў,
Мужнасць у сэрцы чым,
Слесар з Луганска, жалезны нарком,
Родны таварыш Клім.

Друг і саратнік правадыра,
Верны радзімы сын.
Ты нас паклічаш — будзе пара —
Устанем сцяной, як адзін.

Сталінскай ласкай сагрэты жывой
Край беларускі мой.
Ён ганарыцца па праву табой,
Славай высокай тваёй.

Гэтаму.... краю цудоўных пабед
Родны ты друг і брат,
Ты, наш арол, у Вярхоўны Совет
Слаўны яго дэпутат.

Масква, лістапад, 1937 г.

Адась Русак

БУДЗЁННАЎЦЫ

А ў палях, палях
Дзве дарожанькі,
Дзве дарожанькі
Завіваліся.

А ў бары, бары,
Ля крутой гары
Дзве дарожанькі
Скрыжаваліся.

Па адной-жа з іх
Цераз цёмны лес
Ехала дванаццаць
Польскіх коннікаў.

Па другой-жа з іх
Цераз цёмны лес
Ехаў наш атрад —
Сем будзённаўцаў.

А ў бары, бары,
Ля крутой гары,
Дзе дарогі дзве
Скрыжаваліся,

Паміж стромкіх хвой
На смяротны бой
Тут разведкі дзве
Ды спаткаліся.

І ўзвіліся ўверх
Саблі войстрыя,
Узняў віхор пяскі
Прыдарожныя.

Паляцелі з плеч,
Паваліліся
Панскі голавы
Ды варожыя.

А ў бары, бары
Носяць спеў вятры
Па-над хмарамі,
Па-над зорамі,

Дзе навек ляглі
На сырой зямлі
Панскі коннікі —
Люты ворагі.

А ў палях, палях
Дзве дарожанькі,
Дзве дарожанькі
Завіваліся,

Па дарожках тых
На канях ліхіх
Сем будзённаўцаў
Ды вярталіся.

Гор. Ленінград.

Б. Сасноўскі

УСТАЕ З-ЗА ЛЕСУ СОНЦА

Устае з-за лесу сонца,
Умываецца расой.
Хмарак светлых валаконцы
Гоніць вецер чарадой.

Сёння вёска весяліцца,
Спеў чуваць з усіх канцоў:
Ад'язджаюць на граніцу
Восем хлопцаў- малайцоў.

Кожны дужы і высокі,
Самы лепшы сярод нас.
Са сцягамі ў шлях далёкі
Выпраўляе іх калгас.

Тут бацькі іх дарагія,
І падлеткі, і дзяды...
Коні рвуцца варанныя,
Срэбрамззяюць павады.

Грае музыка.
Гамоняць...
Ясны, цёплы дзень стаіць.
Песні, песні і гармонік
Заліваецца, звініць.

Навучала сына матка:
— Зоркім будзь на рубяжы.
Матчын край, маё дзіцятка,
Так, як вока, беражы.

К нам—на нашыя палеткі,
У святлом заліты дом
Вораг лезе ўнепрыкметку
І, як гад, паўзе крадком.

І дзяўчына падыходзіць,
Што з суседняга сяла:
— Любы мой, цябе праводзіць
Я з падружкамі прышла.

Кажа так на развітанне:
— Ты вартуй совецкі край...
Майму брату прывітанне
Ад калгаса перадай.

Вернай будзь яму падмогай,
Будзь байцом сярод байцоў,

. . . .

Выязджалі ў пуць-дарогу
Восем радасных хлапцоў.

З. Бядуля

АБ НАШЫХ НЕДАХОПАХ

Дом у тры паверхі, чацверты паверх — напоўпадвальнае памяшканне. Дзве легкавыя машыны, адзін грузавік. У доме швейцары, вартаўнікі, прыбіральшчыцы, дырэктары, загадчыкі, падгадчыкі і падпадзагадчыкі, свая паліклініка з штатам дактароў і прафесароў. Некалькі бухгалтэрый, кас і г. д. і г. д. Штат нагадвае, паводле свайго размаху, кіраўніцтва фабрыкі альбо завода ў тысячу чалавек. Калі дадаць да гэтага яшчэ не малы жыллёвы дом і домікі, цэлую ферму на раёне са сваім штатам, даволі вялікім, дык пачынаеш адносіцца з нейкай жахлівай павагай да гэтай вялікай па размаху ўстановы.

Працы тут даволі шмат. «Грамадскай нагрузкі» таксама салідная колькасць: заявы аб дапамозе, кожнагадовыя рамонты дома, дамоў і домікаў, часам па два разы на год, абгаварэнне рамонтаў, прыём рамонтаў, планы на новыя рамонты. Зацвярджэнне камандыровачных справаздач, новыя камандыроўкі, 1001-шы раз чытанне дзякоўскім тонам доўгага спісу нявернутых даўгоў, і г. д. і г. д.

Людзей тут навучылі быць актыўнымі. На сходы прыходзяць акуратна. Паспрабуй хто не з'явіцца, — ого! Тады малодшы загадчык старэйшага падзагадчыка дасць табе такі наганяй, што не будзеш ведаць, дзе дзецца. Сядзіш на гэтых сходах па 4, 6 і больш гадзін і слухаеш да абалдзення прамовы аб такіх надакучлівых гаспадарчых справах, якія не сніліся і тваёй прабабцы і не будуць сніцца твайму праўнуку. І сам ты павінен выступаць на такім сходзе не адзін раз, а тры-чатыры разы. У праціўным выпадку ты не актыўны. Кожны раз пасля такога схода прыходзіш дамоў стомлены, як д'явал, і два дні няздольны напісаць ні аднаго радка. У галаве туман гаспадарчых спраў: лічбы, пазыкі, бензін, дэфіцыты.

Прашу прабачэння. Я не сказаў спачатку, што гэта гаворыцца аб Доме пісьменніка і аб працы Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Канешне, абслугоўваючага штату ў тры разы больш тут, чым пісьменнікаў. Канешне, на сходах аб гаспадарчых справах гаворыцца ў некалькі разоў больш, чым аб непасрэдных творчых пытаннях. І ў канцы канцоў не ведаеш: гэта нейкі будаўнічы трэст, пазычковы банк, бюро па розных справах — альбо Саюз пісьменнікаў?

Можа думаеце, што пісьменнікі хоць рэнтабельна выкарыстоўваюць для сябе гэтыя вялікія дзяржаўныя сродкі? Не! Сродкі гэтыя круцяцца ў гучнай безгаспадарчай малатарні, і пісьменніку ад іх ні холадна, ні цёпла.

Творчым пытанням і творчай працы пісьменнік аддае мала часу — заядаюць сходы. Пісьменнік апускаецца. Невялічкі круг кіраўнікоў і падкіраўнікоў раз'яздджае па рознастайных камандыроўках і вандраваннях. Іншыя адседжваюцца дома. Раз'язджаюць па камандыроўках і вандруюць заўсёды адны і тыя самыя, і сядзяць дома заўсёды адны і тыя самыя. Рэдка хто едзе ў раён вывучаць калгаснае жыццё, рэдка хто знаёміцца з лепшымі людзьмі радзімы, каб напісаць хоць-бы лірычны верш, навелу, альбо нарыс для газеты. Рэдка хто мае хоць якую-небудзь сувязь з рабочымі-стаханаўцамі фабрык і заводаў у горадзе. Адчуваецца застой.

Калі некаторыя пісьменнікі здолелі напісаць за апошнія годы і томікі вершаў і апавяданняў, і п'есы, і нават оперныя лібрэта, дык не таму, што ім дапамагалі ў кіраўніцтве Саюза пісьменнікаў, а таму, што яны «адарваліся ад мас» вялікага штату Дома пісьменнікаў і пэўны час не прыходзілі на пустыя гаварыльні, а ціха і ўпарта працавалі дома.

Можа думаеце, што крытыкі дапамагалі ім у гэтым? Не. Не думайце. Хоць нашыя крытыкі і ўзялі на сябе ролю правадыроў пісьменнікаў, але, каб пісьменнікі паслухаліся розных парад крытыкаў раўняцца па таму ці іншаму з любімых імі, крытыкамі, у свой час «геніяў», — было-б вельмі і вельмі кепска. Бо некаторыя з такіх «геніяў» аказаліся ворагамі народа.

А па падручніках-жа гэтых крытыкаў настаўнікі па ўсіх нашых школах доўгія годы навучалі дзяцей!

Умелі замаскаваныя пад пісьменнікаў ворагі народа адурманьваць, асляпляць крытыкаў. А як толькі ворагі народа былі выкрыты адпаведнымі органамі, тады і крытыкі расплюшчылі вочы: бяздарныя, нудныя, нікудышныя пісьменнікі, закрычалі яны. А ўсяго на месяц раней такія пісьменнікі былі «геніяльнымі».

Я раіў-бы нашым крытыкам прагледзець усе свае творы спачатку да канца і праверыць свае ўласныя супроцьлеглыя погляды ў ацэнцы адных і тых самых пісьменнікаў. Гэта цікавы эксперымент. Думаю, што яны, крытыкі, не мала чырванелі-б. Было-б з поўбяды, каб крытыкі былі скромнымі і не ставілі кожны раз свае крытычныя экспромты за закон для школ і грамадства. Скромнасці ў іх і па сёнешні дзень няма. Ёсць пафас. Яны, крытыкі, абсалютна не бянтэжацца. Рабілі грубыя памылкі. Дык у чым справа? Набожна пабілі сябе ў грудзі, ды з ранейшым пафасам выступілі супроць ранейшых сваіх павучанняў і ранейшых сваіх установак. А крытыка па сістэме «взирая на лица» існуе ў нас і па сёнешні дзень.

У працы з пачынаючымі пісьменнікамі ў нас і па сёнешні дзень усё ідзе па-старынцы. Рэгістрацыя: трыццаць новых паэтаў і такая-та лічба празаікаў. У планах сваіх кіраўнікі габінета маладога аўтара мяркуюць адкрываць курсы літаратуразнаўства — ніто ў аб'ёме сярэдняй асветы, ніто вышэйшай. Пісьменнікі павінны стаць лектарамі. Гэта зноў-жа не функцыі пісьменніка, а выкладчыкаў сярэдніх і вышэйшых школ.

Я лічу, што толькі канкрэтная сувязь паміж пісьменнікам і пачынаючым можа прынесці карысць, а не канцылярская рэгістрацыя лекцый пісьменнікаў па літаратуразнаўству. Праца пісьменніка з пачынаючым — гэта найлепшая традыцыя сувязі старэйшых майстроў з маладымі. Такая традыцыя цягнецца ад геніяльнага мастака Леанарда да Вінчы да вялікага пролетарскага пісьменніка Аляксея Максімавіча Горкага.

Што датычыць прыёму пісьменнікаў у саюз, то не трэба рабіць гэта паспешна, не трэба ператвараць гэта ў нейкі рытуал пасвячэння ў рыцарскі ордэн. А тут выходзіць так, што да набыцця членскай кніжкі пачынаючы аўтар—не пісьменнік, а як толькі яе атрымае — становіцца пісьменнікам. Чытач зусім не цікавіцца членскай кніжкай пісьменніка. Большасць чытачоў нават не ведае аб існаванні такіх кніжак. Членская кніжка, выдадзеная ў парадку кампаніі, — гэта зноў-жа пустая рэгістрацыя, якая многіх маладых аўтароў часта асляпляе. Галоўнае — якасць твораў. А бяда ў тым, што само наша праўленне мысліць, нібы чым больш членскіх кніжак будзе выдадзена маладым, тым больш пісьменнікаў у нас будзе. На гэта паказвае той імпэт, з якім праўленне ў апошні час шэпча ў вушы маладым: «падавай заяву аб прыёме ў саюз».

Доўгі час у ДВБ арудвалі ворагі народа, і не дзіва, што твор пісьменніка друкаваўся тры, чатыры і пяць год, не дзіва, што былі любімчыкі і пасынкі ў былых дырэктароў выдавецтва. Аднак, «пісьменнікам», якія пасля былі выкрыты як ворагі народа, там надавалі вялікіх авансаў на неіснуючыя творы, а другія, сапраўдныя пісьменнікі, па году хадзілі спаганяць ганарар за свае надрукаваныя, прададзеныя кнігі. Дзіва, што па сёнешні дзень у некаторых працаўнікоў выдавецтва засталіся старыя адрыжкі. Прыходзіш у выдавецтва і галоўны рэдактар беларускай мастацкай літаратуры пачынае даводзіць табе, што літаратурная праца — гэта наогул не праца, і сыпле на цябе без усякай падставы цэлы град лаянкі. Гэта вельмі ненармальна. Нам неабходна, замест лішніх гаспадарчых спраў у нашым саюзе, якія вісяць абузай над намі, мець адну гаспадарку — сваё выдавецтва. Гэта нам так-жа неабходна, як дыхаць свежым паветрам. Гэта пазбавіць нас ад зняваг і валакіты з боку некаторых бюракратаў, якія яшчэ знаходзяцца ў ДВБ.

Аб нашых недахопах можна шмат гаварыць і ілюстраваць іх шматлікімі фактамі, але я лічу, што аб гэтым павінны выказацца ўсе нашы таварышы. Зноў-жа, калі я гавару выключна аб недахопах, дык гэта не значыць, што не бачу дасягненняў, якія ў нас ёсць за апошнія годы. Дасягненняў шмат, але ў цэнтры ўвагі гэтых маіх нататак — нашы недахопы. Таксама, калі я гавару аб недахопах, дык не значыць, што я ў іх сам не вінаваты. Я вінаваты нароўні з кожным членам нашага саюза.

Мы, нарэшце, павінны перагледзець сістэму працы Саюза пісьменнікаў і стварыць усе ўмовы для таго, каб пісьменнік займаўся выключна творчай працай.

МАЙСТЭРНІ МАСТАКОЎ

На ваколіцы горада — на Усходняй вуліцы—вырас вялікі каменны будынак незвычайнай архітэктуры. Высокі фасад без ваконных прасветаў глядзіць на поўдзень. Але з паўночнага боку новы будынак радуе вялікім памерам сваіх вакон — амаль суцэльнымі шклянымі сценамі і шкляным нахіленым дахам.

Новы будынак — майстэрні мастакоў, якія пабудаваны спецыяльна для лепшых майстроў жывапісу і скульптуры сталіцы Совецкай Беларусі. І дзіўная архітэктура тлумачыцца жаданнем мастакоў забяспечыць сябе роўным, спакойным, так званым «паўночным святлом».

Майстэрні мастакоў — значнае дасягненне на фронце культуры, яркае праяўленне клопатаў партыі і ўрада аб умовах творчасці работнікаў соцыялістычнага мастацтва.

Майстэрні маюць велізарныя залы—два для скульптараў і чатыры для жывапісцаў. Майстэрні абсталяваны мэбляй — канапамі, шафамі, столікамі.

Майстэрні размеркаваны. Залы для скульптараў прадастаўлены Бразэру і Керзіну, дзве залы—жывапісцам Волкаву і Пашкевічу. У адной зале размесціцца студыя маладых жывапісцаў. Скульптар Бразэр прывёз ужо свае станкі, гліну і ў бліжэйшыя дні пачынае працаваць.

Праўда, гаспадар майстэрань — праўленне Саюза совецкіх мастакоў— мала клапоціцца аб забеспячэнні майстэрань усімі вытворчымі і бытавымі «дробязямі». Да гэтага часу, напрыклад, майстэрні не маюць вады: не праведзен вадаправод.

Затое шмат зусім непатрэбнай вады... на сценах, на століі. Менбуд, які будаваў майстэрні, пакрыў самыя адказныя месцы даху толем, ды яшчэ, відавочна, старым. Таму новыя сцены і столь у многіх месцах квітнеюць ужо вялікімі плямамі вільгаці і бруду.

Да гэтага часу майстэрні не маюць электрычнага святла.

Няма тэлефона, а патрэбен ён надзвычай: майстэрні знаходзяцца на адлегласці паўтара кілометра ад трамвайнай астаноўкі.

Трэба стварыць для скульптараў і жывапісцаў усе ўмовы для таго, каб яны змаглі пачаць у самы бліжэйшы час плённую творчую работу ў новых майстэрнях.

І. ВОЛГІН.

СПРАВЫ ЛІТФОНДАЎСКІЯ

Ворагі народа, карыстаючыся палітычнай блізарукасцю работнікаў беларускага аддзялення Літфонда СССР, наклалі сваю брудную лапу на дзяржаўныя грошы, атрымліваючы тысячныя сумы на рамонт кватэр, авансам пад «актуальныя творы», што быццамбы «пісаліся» імі. У гэты-ж час кадры растучых маладых пісьменнікаў і паэтаў не мелі ніякай падтрымкі.

Падаючы ніц перад «начальствам», работнікі Літфонда не падыходзілі сур'ёзна, не прыглядаліся ўважліва да людзей, якім даваліся грошы. Тут не глядзелі на творчасць пісьменніка, а толькі на «імя». І гэта «імя» атрымлівала грошы ў неабмежаванай колькасці.

Яшчэ і па сёнешні дзень выкрытыя бандыты ад пяра вінаваты Літфонду вялікія грошы, якія ў агульнай суме, па скромных падліках самога Літфонда, складаюць 5.000 руб.

«Праслаўлены» сваімі п'янкамі і ўменнем здабываць грошы Р. Кобец вінаваты Літфонду 1.471 руб. яшчэ з 1935 года.

Агульная запазычанасць Літфонду складае 11.000 рублёў.

Дырэктар Літфонда тав. Кунькоў быў упаўнаважаны праўленнем Літфонда выдаваць пазыкі «па свайму погляду», што называецца «на вока», і выдаваў іх людзям, якія не маюць ніякага дачынення да ССПБ і Літфонда (па шчодрасці і дабраце сваёй, так сказаць), а начальству (напрыклад, Александровічу) выдаваў нават без усякіх распісак у атрыманні.

З прычыны такога папусціцельства з боку праўлення Літфонда атрымалі пазыкі заг. медгабінетам Хайноўская, кіраўнік спраў ССПБ Крывіца і інш.

У той час, калі на рамонт і абсталяванне кватэр ворагаў народа выдаткаваліся тысячы рублёў, каб стварыць ім умовы для «пленнай работы», многія пісьменнікі заставаліся жыць у неадрамантаваных кватэрах, альбо зусім без іх. Кватэрнае пытанне і цяпер яшчэ для некаторых пісьменнікаў з'яўляецца балючым пытаннем. Ёсць такія пісьменнікі, якія ўжо некалькі год дамагаюцца атрымання кватэры, у некаторых з іх нямалыя сем'і. Праўленне ССПБ і Літфонд звычайна матывуюць адмаўленне ў кватэры адсутнасцю кватэрнага фонда, а ў той-жа час па асабістаму загаду выконваючага абавязкі старшыні праўлення ССПБ тав. Лынькова яны прадастаўляюць кватэры такім «буйным мастацкім адзінкам» ад справаводства і бухгалтэрыі, як кіраўнік спраў Крывіца, бухгалтар Хамёнак, дырэктар Літфонда Кунькоў, якія, як вядома, не з'яўляюцца ні членамі Саюза пісьменнікаў, ні членамі Літфонда. А, між тым, нават адзін з старэйшых пісьменнікаў — тав. Маўр не атрымаў да гэтага часу кватэры, не гледзячы на тое, што кватэрны фонд Саюза пісьменнікаў быў даволі вялікім.

Гэтыя факты кажуць пра тое, што ў праўленні саюза і, тым больш, у праўленні Літфонда адсутнічаюць клопаты аб пісьменніку, аб маладых пісьменніках, клопаты аб тым, каб стварыць пісьменніку нармальныя бытавыя ўмовы для работы, для напісання сапраўдных совецкіх твораў.

Трэба таксама спамянуць тут і пра беззваротныя сумы Літфонда, якія выражаюцца ў дзесятках тысяч рублёў і выдаюцца не толькі пісьменнікам і не толькі на патрэбы, прадугледжаныя каштарысам Літфонда, а проста мінуючы ўсякія правілы. Так, напрыклад, у той час, як Літфонд адмаўляецца рамантаваць кватэры хоць-бы аднаму з пісьменнікаў з прычыны адсутнасці сум па каштарысу, ён выдаў Гусеву каля 700 руб. на рамонт кватэры, а нечлену саюза Хайноўскай выдаў беззваротную ссуду.

На лячэбны габінет з сум Літфонда патрачана 4.600 рублёў. А калі паглядзець, хто бывае на прыёмах ва ўрачоў, калі праверыць рэгістрацыйныя карткі, дык можна ўбачыць пляменнікаў, пляменніц і больш далёкіх сваякоў супрацоўнікаў Саюза пісьменнікаў і Літфонда, якія прыязджаюць з раёнаў, і нават такіх людзей, якіх зусім не ведае заг. габінетам тав. Хайноўская.

Дом адпачынку ў Пухавічах за 1937 год з'еў каля 88.000 рублёў. Аднак, абслугоўванне ў ім пастаўлена вельмі дрэнна. З пісьменнікамі абыходзяцца груба. «Начальства» гэтага дома складалася з розных мярзаўцаў і прахадзімцаў, сабраных Літфондам і пастаўленых «кіраваць» домам і, так сказаць, «забяспечваць» пісьменнікам добрыя ўмовы для адпачынку і творчасці.

Не гледзячы на неаднаразовыя сігналы пісьменнікаў пра тое, што дырэктар дома адпачынку—мярзкая і падазроная асоба, праўленне Саюза пісьменнікаў абмежавалася пасылкай туды камісіі, у склад якой уваходзілі (і адыгрывалі галоўную ролю) ворагі народа і людзі, якія не маюць ніякіх адносін да Саюза пісьменнікаў. Можна сказаць, самім складам камісіі Саюз пісьменнікаў прадвызначыў ужо апраўданне мярзаўца. Тым больш, што дырэктар Літфонда заўсёды вельмі ўпарта абараняў дырэктара дома адпачынку.

Трэба сказаць, што новае праўленне Літфонда, выбранае тайным галасаваннем, праяўляе выключную бяздзейнасць. Старшыня праўлення тав. Крапіва, які нясе поўную адказнасць за справы літфондаўскія, зусім адышоў ад работы Літфонда, махнуўшы на ўсё рукой, прадаставіўшы справу самацёку.

У Літфондзе вельмі шмат часу ўдзяляюць усякім раз'ездам і камандыроўкам. Ездзяць у камандыроўкі, каму трэба і каму не трэба. Для зацвярджэння баланса ў Маскву выязджалі на даволі доўгі час аж тры работнікі Літфонда (загадчык, бухгалтар, заг. медыцынскім габінетам).

Ёсць выпадкі, калі Літфонд аплачвае сваім работнікам камандыровачныя, перавышаючы дзяржаўныя стаўкі. Выканаўца даручэнняў Літфонда Альперовіч раз'язджае толькі ў мяккіх вагонах! Што ўжо тады сказаць пра самога дырэктара? У выніку такой безгаспадарчасці Літфонд перавыдаткаваў даволі вялікую суму грошай па камандыроўках.

З усяго гэтага можна зрабіць вывад, што работнікі Літфонда са сваімі задачамі не справіліся і пытанне аб іх у Саюзе пісьменнікаў павінна стаць спецыяльна і ў першую чаргу.

Трэба накіраваць работу Літфонда на клопаты пра пісьменніка, а не на клопаты аб саміх работніках Літфонда. Бо да гэтага часу Літфонд сапраўды абслугоўваў толькі сам сябе.

ЦІТОЎ

М. В. ФРУНЗЕ Ў МЕНСКУ

(УРЫВАК З АПОВЕСЦІ)

Галоўны ваенны суд адмяніў пакаранне смерцю, але гэта было простае адцягванне часу. Арсеній, які знаходзіўся некалькі месяцаў пад заўсёднай пагрозай смерці, сустрэў гэтую вестку зусім абыякава. Ен ведаў, што ў турме не даруюць яму яго незалежнасці (аднаго разу ён, аброслы, схуднялы смертнік, цэлую гадзіну ушчуньваў турэмнага прыстава і той, збянтэжыўшыся ад смеласці зняволенага, як школьнік, маўкліва слухаў яго гнеўную прамову). Адмяненне пакарання смерцю галоўны ваенны суд матываваў адсутнасцю доказаў. Здавалася-б, што пасля гэтага для Арсенія, які ўжо не першы год пакутваў у катаржнай турме, пагроза смерці перастала існаваць, але мясцовая турэмная адміністрацыя прадаўжала тачыць зубы на непакорнага, з непахіснаю воляй, барацьбіта.

Яго судзілі зноў, зноў прыгаварвалі да пакарання смерцю і зноў пакаранне смерцю замянялася доўгімі годамі зняволення.

Больш у турэмнай абстаноўцы нельга было заставацца, найменшы неасцярожны крок пагражаў яго жыццю. Акрамя таго, ён ні хвіліны не мог бяздзейнічаць, адгароджаны турэмнымі сценамі. Трэба было ўцякаць, уцякаць зараз-жа, безадкладна, не трацячы больш ні аднаго дня.

І ён уцёк у Забайкалле.

Перамяніўшы прозвішча, ён спяшаўся ўключыцца ў актыўную рэволюцыйную работу. Але ў Чыце (дзе ён працаваў пад прозвішчам Васіленка) заставацца было небяспечна. Фрунзе вырашыў быць бліжэй да фронта, вайна зацягвалася і можна было чакаць новых вялікіх падзей. Фрунзе, па новаму пашпарту Міхайлаў Міхаіл Александравіч, едзе ў Менск.

Фрунзе ўпершыню трапляе ў Менск. Горад быў падобны на ваенны лагер. Блізкасць фронта адчувалася на кожным кроку. На прывакзальных пуцях класныя вагоны губляліся сярод патрапаных вайсковых цяплушак. Віднеліся адкрытыя платформы з гарматамі. Сярод мора салдацкіх фуражак мільгалі белыя касынкі сясцёр міласэрнасці. Брэнькаючы шпорамі, праходзілі франтаватыя паручыкі, сустракаліся пажылыя абрузглыя генералы з шырокімі каляровымі лампасамі на нагавіцах. Яны ішлі самавіта, нібы на шпацыр, валаўляна-абыякавымі вачыма акідваючы сустрэчных і нехаця, ледзь прыкметным прыкладваннем рукі да казырка, адказваючы на бясконцыя прывітанні.

Фрунзе ехаў у Менск па накіраванню ЦК. Ен павінен быў звязацца з мясцовай большэвіцкай арганізацыяй і, не хаваючыся ў падполле, пад прозвішчам Міхайлава скарыстаць найменшыя легальныя магчымасці для сур'ёзнай палітычнай работы. Ен прагнуў справы — пакутлівае сядзенне ў катаржнай турме, ссылка былі для яго неўгамоннай натуры ўдвая цяжэй за вымушанае бяздзелле.

Выйшаўшы на прывакзальную плошчу, ён па канспіратыўнай звычцы азірнуўся назад — ці не валочыцца за ім «хвост». У бакавой кішэні ляжаў надзейны пашпарт, ён прызвычаеным рухам абмацаў яго. «На месцы», — падумаў Міхайлаў і рашуча пайшоў уперад.

Звонку ён таксама быў непазнавальны. Ды і хто яго пазнае ў Менску — у гэтым бурлівым франтавым катле, дзе штодзённа мяняюцца тысячы твараў, прыходзяць і адыходзяць цэлыя злучэнні, па чыгуначных пуцях прабягаюць эшалоны, палохаючы хлапчукоў з гіканнем праносяцца казакі і, грукочучы шматтоннымі гарматамі, адыходзіць у далеч артылерыя. На плошчы, запрэжаная ў тры гнедыя кані, спынілася конка. Міхайлаў з усмешкай паглядзеў у бок яе. Ен даўно ўжо не бачыў такога дапатопнага спосабу перамяшчэння.

У Чыце Міхайлаў працаваў у перасяленчым упраўленні статыстыкам. Гэта не было яго асноўнай спецыяльнасцю. У той час ён лічыў сябе знаўцам сталярнай справы (навучыўся на катарзе) і ганарыўся гэтым. Нават тады, калі яго ваенная слава грымела па ўсяму свету і адно імя Фрунзе прыводзіла ў паніку ворагаў, ён на анкетнае пытанне—якія ведаеце спецыяльнасці— з найвялікшай скромнасцю пісаў: «сталярную справу», а потым дадаваў: «і ваенную». Але ў Чыце давялося працаваць статыстыкам. З рэшты-ж і на гэтай сухой бяскрыўднай рабоце начальства хутка звярнула ўвагу на скромнага працаўніка Владзіміра Грыгор'евіча Васіленка (пад такім прозвішчам Фрунзе пражываў у Чыце). Але ён ужо спяшаўся выехаць з Чыты і таму не прыняў прапанову заняць іншую работу ў тым-жа перасяленчым упраўленні.

Кватэра статыстыка Васіленка ў Чыце была месцам гарачых партыйных гутарак, і чыцэнскі камітэт РСДРП, ледзь толькі Фрунзе асталяваўся ў горадзе,



нагрузіў яго сур'ёзнай рэдактарскай работай. І ў катаржнай турме Міхаіл Васільевіч злаўчаўся шмат пісаць, на пасяленні ён стварыў нават невялічкі журнальчык «Восточное обозрение», які сам рэдагаваў, але цэнзура скоўвала яго па руках, таму толькі ў нелегальным партыйным друку, які меў шырокае распаўсюджанне, ён упершыню пасля доўгага перапынку набыў магчымасць ва ўсёй паўнаце выявіць свае літаратурныя здольнасці.

У Менску, як і ў Чыце, Міхайлаў вырашыў заставацца статыстыкам. Гэтая работа адбірала не так ужо шмат часу, з матэматыкай ён быў у ладах, апрача таго, лічбы маглі спатрэбіцца ў будучым. Ужо праз некалькі дзён у камітэце Заходняга фронта Усерасійскага земскага саюза з'явіўся новы служачы, які разумна, не чакаючы пакуль спытаюцца, здаў свае дакументы, што скупа расказвалі пра ўпаўне благанадзейнае жыццё Міхайлава, Міхаіла Александравіча.

Быў красавік 1916 года. Людзі не заўважалі вясны, бо ў паветры насілася смерць. Лавінай адкатваліся бліжэй да Расіі змучаныя гразкімі акопамі і трэцяй зімой вайны салдаты. Бяздарнасць і прадажнасць царскіх генералаў відаць была на дзесятках прайграных баёў, якія пры наяўнасці дастатковай зброі можна было-б выйграць. Але вясна не лічылася ні з чым. Нават тут, у прыфронтавой паласе, у самай блізкасці да бесперапыннай артылерыйскай кананады, дзе магутныя снарады бязлітасна неслі за сабою смерць, — яна, красавіцкая вясна 1916 года, была цудоўная.

У вольныя хвіліны, а іх было вельмі мала, бо адразу пасля прыезду ў Менск Міхайлаў уключыўся ў актыўную партыйную работу, ён любіў блукаць па гораду. Паўз брук імчаліся вясеннія ручны, у садзе на дрэвах прыгалі з галіны на галіну першыя гракі.

Шукаў ён сустрэч з людзьмі і часта любіў гутарыць з салдатамі. Ды і было аб чым. Яны праклінаюць вайну. Аднойчы, пасля звычайнай вячэрняй прагулкі, выходзячы са сквера, ён заўважыў параненага салдата, які згубіў кастыль. Салдат бездапаможна азіраўся па баках. У яго да таго-ж была перавязана левая рука і ён разгублена чакаў дапамогі. Міхайлаў падняў кастыль, хустачкай абцёр з яго гразь і падаў параненаму.

— Даўно паранены? — запытаўся ён.

— Год будзе.

— Мясцовы?

— Не, з Палесся. Паехаў дадому, а там пуста: бацька памёр, братоў таксама на фронт забралі. Дом закалочаны, толькі сабака на двары з голаду вые.

Да позняга вечара Міхайлаў гаварыў з параненым, купіў яму папярос, на развітанне падбадзёрыў:

— Ты вось не ведаў, за каго і з-за чаго ваюеш, нагу і руку аддаў, а вось хутка за нашу агульную справу біцца будзем.

Інвалід усміхнуўся. Ен даўно не чуў такога цёплага спачування, як з вуснаў гэтага аброслага шчаціністай барадой чалавека.

— Ну, бывайце, можа і сустрэнемся...

— Дзякую, дарагі, век не забуду сустрэчы з табой.

На працаўнікоў Земсаюза глядзелі з вялікім высокамер'ем. У масе было створана шмат агідных мянушак па іх адрасу, «земгусары» — было адно з ходкіх слоў. Сярод статыстыкаў знайшліся патрыёты, якія парашылі перамяніць шчоты на вінтоўку. Стаяць у баку ад іх Фрунзе было няёмка.

— Міхайлаў, паедзеце на фронт? — пытаюцца саслужыўцы.

— З ахвотай...

Яго запісваюць добраахвотнікам на правах вольнаапрадзяляючагася І разраду ў 57-ю артылерыйскую брыгаду, але партыя не можа адпусціць яго з Менска. Ен патрэбны тут, ды к таму-ж нелегальны пашпарт на імя Міхайлава не можа зрабіць яго становішча ў брыгадзе цвёрдым. Варта раскрыць яго сапраўднае імя і тады палявы суд і, у трэці раз, — смяротны прыгавор.

Дактары, аглядаючы Міхайлава, прызнаюць яго не ўпаўне годным. Ваенная служба добраахвотніка 57-й артылерыйскай брыгады прыходзіць да канца. Ен вяртаецца ў земскі саюз.

Яму зараз няма магчымасці аддаваць столькі-ж увагі службе, колькі ён аддаваў раней. Большэвіцкая партыйная арганізацыя ў Менску расце. Фрунзе—у цэнтры яе.

На службе-ж яго загружаюць. Ен ужо не статыстык, яго паслядоўна высоўваюць памочнікам раённага загадчыка гаспадаркі, раённым загадчыкам і, нарэшце, на яго ўскладаюць увесь гаспадарчы аддзел земскага саюза 10-й арміі.

Клопатаў — не абярэшся. Па дарогах Беларусі цягнуцца з сваім мізэрным скарбам абозы бежанцаў. Участак работы Земсаюза 10-й арміі вялікі і ў першую чаргу прыходзіцца дапамагаць бежанцам. Міхайлаў не спіць начамі. Ен адчувае, што яго прамы абавязак, абавязак большэвіка, дапамагчы беднякам, якія смерценоснай вайной сагнаны з родных месц.

Так праходзіць 1916 год. Халодны студзень 1917 года, трагічныя падзеі на фронце набліжаюцца да развязкі. Ранічою ў Земсаюзе з вуснаў у вусны, спачатку шэптам, а потым уголас, перадаюцца апошнія навіны: у Петраградзе галодныя бунты, на фронце братанне. На вакзале ў Менску пробка, многія салдаты адмаўляюцца ехаць на фронт. Расказваюць, што нейкі штабскапітан на платформе застрэліў салдата, які адмаўляўся садзіцца ў вагон. Абураныя салдаты павыскоквалі з цяплушак і прыкладамі збілі капітана. Жандары ледзь выратавалі яго ад смерці...

Міхайлаў больш не паяўляецца ў Земсаюзе. Не да гэтага. У апошніх лічбах лютага тэлеграф прынёс паведамленне аб падзеях у Петраградзе. Менскія газеты баяліся надрукаваць тэлеграму. Міхайлаў званіў на тэлеграф.

— Так, правільна...

А ўжо на другі дзень вуліцы Менска былі запоўнены маніфестантамі. Маніфестацыю — у ёй удзельнічалі і салдаты з яркімі чырвонымі бантамі на шынялях — арганізавала падпольная рэволюцыйная арганізацыя Менска, якая мела свае разгалінenні ў 10-й і 3-й арміях. На чале арганізацыі стаяў «найблаганадзейнейшы статыстык» Земсаюза, двойчы прыгавораны царскім судом да пакарання смерцю, уцякач з катаргі Міхаіл Александравіч Міхайлаў, ён-жа Міхаіл Васільевіч Фрунзе, а па падпольнай клічцы — Арсеній.

У апошніх лічбах лютага ў горадзе паявіўся загад аб прызначэнні новага начальніка міліцыі. Гэтае слова ўпершыню гаварылася адкрыта. Новы начальнік міліцыі Міхайлаў (для чыноўнікаў з Земсаюза яго прызначэнне было тое самае, што гром сярод белага дня) з першых-жа дзён праявіў свае арганізатарскія і ваенныя здольнасці, якія з такім блескам выявіліся ў далейшым.

Менская паліцыя, якая неаднаразова атрымоўвала высачайшыя падзякі за «вернападданіцкую службу» і шчодра выдаткавала патроны на падаўленне рэволюцыйнага руху, лічылася адной з найбольш моцных у царскай Расіі. Нездарма яе пеставаў калісьці сам Курлоў. Фрунзе на працягу двух дзён ачысціў горад ад паліцыі, абяззброіў яе і арыштаваў главароў. На вуліцах паявіліся грамадзянскія міліцыянеры з чырвонымі павязкамі на рукавах. Не гледзячы на тое, што горад быў запруджаны прыезджымі, іменна ў гэтыя дні кражы, рабункі ў горадзе прыкметна паменшыліся і Фрунзе, раніцою праглядаючы зводку здарэнняў, спяшаўся рэагаваць на кожнае нераскрытае злачынства.

У каменным двухпавярховым доме па Петраградскай вуліцы сабраўся першы Совет рабочых дэпутатаў Менска. З першага-ж дня сярод дэпутатаў відаць была рухавая постаць Фрунзе. Салдацкі шынель, летняя фуражка зялёнага колеру, густыя чорныя вусы, завостраныя ў канцах. Ен жвава гутарыў з людзьмі, толькі-што прыехаўшымі з фронта.

— Шукаеце работы? Да мяне, да мяне, у міліцыі патрэбны людзі...

Сакавік, красавік, май, чэрвень, ліпень, жнівень... Фрунзе ведае ўся Беларусь. Яго можна сустрэць на сялянскім з'ездзе, на салдацкім сходзе, шмат часу ў яго адбірае міліцыя, ён ператварае яе ў сапраўдную баявую сілу,— блізкасць Стаўкі, наяўнасць вялікай колькасці афіцэраў патрабуе гэтага. Яго баявыя здольнасці ацэньваюць па заслугах. Яго прызначаюць начальнікам штаба рэволюцыйных войск Менскага гарнізона ў часе наступлення Карнілава.

Набліжаюцца новыя падзеі. Фрунзе патрэбен у цэнтры. У верасні ён ад'язджае з Менска ў родную Шую каваць жалезныя большэвіцкія сілы.

Еф. САДОЎСКІ.

А. М. ГОРКІ

Дзяўчына і смерць

(КАЗКА)

„Гэта рэч мацней, чым „Фауст" Гётэ
(Каханне перамагае смерць)
11. X. 31 г. І. СТАЛІН"

I.

Пераз вёску ехаў цар з вайны.
Едзе—чорнай злосцю сэрца точыць.
Чуе — за кустамі бузіны
Дзеўчына рагоча.
Грозна бровы рыжыя нахмурыў,
Цар, ударыў шпорамі каня,
Наляцеў на дзеўчыну, як бура,
І крычыць, аж панцыры звіняць:
— «Ты чаго, крычыць ён злосна й груба, —
Ты чаго, дзяўчына, скаліш зубы?
Атрымаў мой вораг перамогу,
Уся мая дружына перабіта,
У палоне палавіна світы,
Еду я дамоў узяць падмогу,
Я—твой цар, гарую, ледзь не плачу.
Як мне смех твой неразумны бачыць».
Захінаючы кафтанік свой,
Адказала дзеўчына цару:
— «Адыйдзі, — я з любым гавару,
Адыйдзі лепш, бацюхна, не стой».

Пакахаеш — і на бок усе цары, —
Гутарыць няма калі з царамі!
Ёсць каханне, што хутчэй гарыць
За свячу ў гарачым божым храме.

Цар знямеў ад лютасці звярынай,
Загадаў сваёй пакорнай світе:
— «Ну-тка, кіньце у турму дзяўчыну,
Альбо, лепш,—адразу задушыце!»
Паслухмяныя скрывіўшы рожы,
Рынулі да дзеўчыны, як чэрці,
Канюхі царовы і вяльможы, —
Аддалі дзяўчыну ў рукі Смерці.

II.

Смерць заўсёды служыць злому верна,
А ў той дзень была ўшчэ не ў настрої,—
Бо вясной жыцця й кахання зерні
Набухаюць нават у старое.
Нудна век мець справу з тухлым мясам,
Вынішчаць там розныя хваробы;
Нудна мераць дні смяротным часам —
Без клапот пажыць ёй да спадобы.
Толькі страх бярэ ўсіх недарэчны
Перад немінучым з ёй спатканнем, —
Збрыдаў жах ёй гэты чалавечы,
Збрыдалі хаўтуры, пахаванні.
Занятая непадзячнай справай
На зямлі мізэрненькай надзвычай,
Абавязак свой нясе са славай, —
Людзі-ж Смерць за непатрэбнасць лічаць.
Ну, яе, вядома, крыўдзіць гэта,
Гневае людская наша ўпартасць,
І са злосці Смерць зжывае з свету
Іншы раз не тых, каторых варта.
Пакахаць Шайтана-б ёй, уволю
Апраметнаю падыхаць спёкай,
Зарыдаць-бы з палюбоўных боляў
Разам з тым Шайтанам агнявокім!

III.

Перад Смерцю злой дзяўчына стала,
Смела ўдару грознага чакае.
Смерць мармыча, — знаць, пашкадавала:
— «Бачыш ты, якая маладая!
Што нагрубіяніла цару?
Я цябе за гэта замару!»
— «Не сярдуй,—прамовіла дзяўчына, —
На мяне злаваць няма прычыны.
Любы цалаваў мяне ласкава
Пад кустом зялёнай бузіны, —
Хіба да цара была мне справа?
Ну, а цар, на грэх, бяжыць з вайны.
Я і гавару яму, цару,
Адыйдзі лепш, бацюхна, адгэтуль!
І не кепска, здаецца, гавару,
А — глядзі, як дрэнна вышла гэта.
Што-ж?! Ад Смерці некуды дзявацца,
Без кахання я памру цяпер.
Смертанька! Душой прашу цябе —
Дай ты мне яшчэ пацалавацца!»
Даіўна гэту мову слухаць Смерці, —
Не прасілі гэтага ніколі!
Думае: «Чым буду жыць на свеце,
Як не будуць цалавацца болей?»

Грэючы на сонцы косці, ціха
Смерць сказала, клікнуўшы змяю:
— «Ну, ідзі, цалуйся, толькі—мігам!
Ноч—твая, а досвіткам — заб'ю!»
Села Смерць на камені, — чакае,
А змяя касу ёй джалам чэша.
Дзеўчына ад шчасця аж рыдае,
Смерць бурчыць: «Ідзі, ідзі хутчэй-жа!»

IV.

Абагрэтая вясновым сонцам,
Смерць разула стоптаныя лапці,
Прылягла на камень і заснула.
Непрыемны сон прысніўся Смерці!
Ёй прыснілася, што бацька, Каін,
З праўнукам сваім — Іскарыётам,
Недалужныя, на гору лезуць, —
Быццам дзве змяі паўзуць паціху.
— «Госпадзі!» — панура стогне Каін,
Цьмянымі глядзіць вачыма ў неба.
— «Госпадзі!» — гукае злосны Юда,
Ад зямлі вачэй не падымае.
Над гарой, у воблаку румяным,
Спачывае бог, — чытае кнігу:
Зорамі напісана ўся кніга,
Млечны шлях — адзін яе лісточак.
На вяршаліне гары архангел
Бліскавіц снапок трымае ў ручцы.
Кажа падарожным ён сурова:
— «Прэч ідзіце! Вас гасподзь не прыме!»
— «Міхаіле!—скардзіцца стаў Каін,—
Ведаю — я грэшны перад светам!
Я радзіў на свет Жыцця забойцу,
Я праклятай, подлай Смерці бацька!»
— «Міхаіле! — гаварыць стаў Юда,-
Ведаю, я грэшны больш, ніж Каін,
Бо аддаў у рукі подлай Смерці
Светлае, як сонца, сэрца бога!»
І абодва клічуць яны ўголас:
— «Міхаіле! Хай гасподзь хоць слова
Скажа нам, хоць толькі пашкадуе —
Даравацць нам мы-ж ужо не молім!»
Ціха ім адказвае архангел:
— «Тройчы гаварыў яму я гэта,
Двойчы не сказаў ён мне нічога,
Трэці раз ён строга так прамовіў:
— Ведай—покуль Смерць жывое губіць,
Юду з Каінам няма збавення.
Хай ім той дарує, чыя сіла
Зможа назаўсёды сілу Смерці».
Тут Братазабойца злы і Здраднік
Горна зарыдалі і завылі
І, абняўшыся, абодва разам
Пакаціліся ў смуроднае балота.
А ў балоце, радыя, шалеюць
Ваўкалак і чэрці.
І плююць на Каіна і Юду
Сінімі, балотнымі агнямі.

V.

Смерць прачнулася пад самы пад палудзень,
Глянула — дзяўчына не прышла!
Смерць мармыча сонна: «Бач, ты, блудзень,
Ноч, відаць, кароткая была!»
Вырвала сланечніку за плотам,
Нюхае, любуецца, як сонца
Аздабляе яркай пазалотай
Ліст асіны ў жоўтыя чырвонцы.
І на сонца гледзячы, запела
Ціха і гугнява, як умела:
— «Злой, бязлітаснай рукой
Людзі бліжняга заб'юць
І хаваюць. І пяюць:
«Са святымі упакой!»
Я не цямлю ад чаго:
Дэспат катуе, збівае,
А як здохне — і яго
З тою-ж песенькай хаваюць!
Злодзей, чэсны хто памёр —
З аднальковаю тугой
Распявае сумны хор:
«Са святымі упакой!»
Дурня, гада ці хамулу
Я заб'ю сваёй рукой,
А для ўсіх спяваюць чула:
«Са святымі упакой!»

VI.

Спела песню — набухае злосцю,
Часу прамінула шмат занадта,
А дзяўчына—не прыходзіць штосьці.
Гэта—дрэнна. Смерці—не да жартаў.
Больш і больш сярдуючы штохвіліна,
Смерць ануч, лапцей абула пару,
Ледзьве дачакаўшы ночы яснай,
У дарогу вышла грознай хмарай.
Шмат прайшла і бачыць: за кустамі,
Пад расістай маладой ляшчынай
На траве, усыпанай лістамі,
Дзеўчына сядзіць вясны багіняй.
Як зямля вясной бывае чыстай,
Грудзі так агалены, аж сорам,
І на скуры тонкай, шаўкавістай
Ярка бачны пацалункаў зоры.
Два саскі, як зоры, на грудзях,
І, як зоры, пазіраюць вочы
Угару, на светлы Млечны шлях,
На дарогу сінякосай ночы.
Пад вачыма блакітнеюць цені,
Быццам рана — губы так чырвоны.
Галаву паклаўшы на калені,
Дрэмле хлопец, як алень стамлёны.
Смерць глядзіць, і ціха горач гневу
Гасне ў яе чэрапе пустым.
— «Ты чаго-ж тут, быццам тая Ева,
Тоішся ад бога за кусты».
Быццам небам — прамяністым целам
Засланіўшы любага свайго,
Адказала ёй дзяўчына смела:
— «Не крычы, спалохаеш яго!
Пачакай, няхай прачнецца мілы,
Востраю касою не пужай!
Я прыду і лягу у магілу,
А яго — надоўга захавай!
Вінавата, не прышла я ў тэрмін,
Думала — да Смерці блізка вельмі.
Дай яшчэ хлапчыну абдыму:
Вельмі-ж добра тут са мной яму!
Ён таксама слаўны! Ты зірні
Вунь якія ён пакінуў знакі —
На грудзях, на шчоках, як агні,
Чырванеюць і цвітуць, як макі!»
Смерць саромна ціха засмяялася:
— «Так, ты быццам з сонцам цалавалася.
Адже бач, — ты не адна ў мяне, —
Тысячы забіць патрэбна мне!
Я-ж сумленна вечнасці служу,
Справы — шмат, я пачала старэць,
Кожнаю хвілінай даражу,
Дык збірайся, дзеўчына, скарэй!»
Дзеўчына сваё:
— «Абдыме мілы,
Неба і зямлі — як не было.
І ў душы няземнай поўна сілы,
І няземнае гарыць святло.
Страх за Лёс не ўладны над табой,
І нікога не патрэбна ў свеце!
Радасць рада за сябе, як дзеці
І каханне дзівіцца сабой».
Смерць маўчыць задумліва і строга,
Бачыць — дзеўчына не перастане!
Не знайсці над сонцам у свеце бога,
Не знайсці агню — ясней кахання!

VII.

Смерць — ні слова, а дзяўчынін голас
Зайздрасці агнём ёй косці паліць,
Кідае і ў пот яе і ў холад,
Сэрца Смерці свету што-ж падарыць?
Смерць не маці, ды жанчына ўсё-ж:
Розумам ўладае пачуццё;
У халодным сэрцы Смерці ёсць
Спачуванне і туга і злосць.
Тым, каму яна каханне дорыць,
Хто паранены ў душу тугою,
Як яна пяшчотна ім гаворыць
Аб вялікай радасці спакою.
— «Што-ж,—сказала Смерць,—хай будзе цуда!
Дазваляю я табе пажыць!
Толькі я з табою поруч буду,
Вечна буду ля Кахання быць!»

З тых часоў Каханне й Смерць, як сёстры,
І дагэтуль неразлучна ходзяць,
За Каханнем Смерць. з касою вострай,
Цягнецца, як зводніца, заўсёды.
Паслушная сястрынай уладзе,
На вяселлях і на пахаваннях,
Скрозь няўтомна і няўхільна ладзіць
Шчасце Жыцця й радасці Кахання.

Пераклаў ПЯТРО ГЛЕБКА.

КІНО

„ВАЛАЧАЕЎСКІЯ ДНІ"

(НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ВЫТВОРЧАСЦІ «ЛЕНФІЛЬМ»)

Народ ведае багата песень. Але ёсць песня, якая жыве ў народзе дзесяткі год. Народ спявае яе з любоўю і шчырасцю. Гэта песня ўслаўляе «штурмавыя ночы Спаска, валачаеўскія дні».

Валачаеўскія дні! У гэтыя дні бясстрашныя партызаны, чырвоныя байцы пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў бязлітасна білі японскіх самураеў, вызвалялі Спаск, Валачаеўку, Уладзівасток, вызвалялі свяшчэнную савецкую зямлю Далёкага Усходу ад японскіх імперыялістаў. Народ спявае аб гэтым у песні. Гэтыя незабыўныя дні майстэрска адлюстраваны ў фільме «Валачаеўскія дні». Народ прагнуў убачыць новую работу братоў Васільевых, аўтараў выдатнага фільма «Чапаеў». І вось яна—«Валачаеўскія дні»—на экране.

Фільм пачынаецца дыялагам амерыканскага журналіста і японскага палкоўніка Усіжымы, які кіруе дэсантам японскіх войск.

— Мэта вашага прыезду? — пытаецца журналіст у палкоўніка.

— Мы прыехалі збіраць незабудкі,— адказвае Усіжыма і хітра ўсміхаецца.

Часам і незабудкі нялёгка сарваць, асабліва калі яны растуць на зямлі, якая паліта потам і крывёю народа... Але радавіты патомак самураеў, верны сцягу «японскага ўзыходзячага сонца», не хоча аб гэтым ведаць.

Для ўсякай дзеі павінна быць прычына. І вось палкоўнік, каб увесці ў Уладзівасток дэсант японскіх войск, стварае прычыну. Ён выклікае да сябе рускага белагвардзейца і даручае яму забіць якога-небудзь японца. Здраднік і слуга чужынцы—белагвардзеец акуратна выконвае даручэнне палкоўніка.

Забойства зроблена. Акупанты пад выглядам «мірных абаронцаў тутэйшых японскіх грамадзян» займаюць горад. Яны імкнуцца ў глыб Далёкага Усходу, іх вабяць багацці Савецкай Расіі аж да Байкала.

З Масквы прыходзіць дырэктыва Леніна і Сталіна:

«Мы лічым становішча надзвычай сур'ёзным і самым катэгарычным чынам папярэджваем таварышоў. Не рабіце сабе ілюзій: японцы напэўна будуць наступаць. Гэта немінуча».

Гэту дырэктыву атрымалі далёкаўсходнія большэвікі.

«Мірныя» дзеянні японскіх салдатаў пашыраюцца. Яны займаюць паселішчы, вёскі, за малейшае супраціўленне расстрэльваюць бязвінных жыхароў. Сярод насельніцтва расце гнеў і абурэнне. Сяляне адыходзяць у тайгу, яднаюцца ў партызанскія атрады. Партыйны камітэт Уладзівастока на дапамогу партызанам пасылае большэвіка Андрэя. Дачка машыніста Маша дапамагае Андрэю прабрацца да партызанскага стану.

Андрэй з партызанамі ў вёсцы, якую нядаўна пакінулі японцы. Іх ветла сустрэла насельніцтва. Вясковыя ўдовы расказваюць аб катаваннях, аб забойствах, аб брудных учынках японскіх рабаўнікоў.

— Мы гэтага не забудзем! — адказвае Андрэй. Ён арганізоўвае, згуртоўвае партызанскія атрады. Маша дапамагае яму дастаўляць зброю.

Японскія атрады прасоўваюцца. Гараць вёскі. На вуліцах — трупы забітых. Агрузлымі нагамі топчуць іх малойчыкі з каманды Усіжымы.

Партызанскія атрады на чале з Андрэем аказваюць японцам рашучае супраціўленне. Яны ўзрываюць масты, завальваюць дарогі, абрываюць тэлеграфныя правады. Супроць захватчыкаў падымаецца ўвесь працоўны народ.

Усіжыма больш не напамінае аб незабудках. Ён заклапочаны выратаваннем сваёй арміі. І тут палкоўнік прымяняе свой улюбёны метад хітрасці і абману.

Андрэй, загартаваны большэвік, кіраўнік партызанаў, ведае ўсе ходы і выхады японскага камандавання. Ён разбіраецца ў самым складаным лабірынце, ён ведае сэнс японскіх разлікаў. Прапанаваны палкоўнікам план перамір'я Андрэй не падпісвае.

Усіжыма ідзе далей. Ён натраўляе белагвардзейцаў на забойства слаўнага кіраўніка партызанскіх атрадаў, бачачы ў гэтым адно збавенне для сябе. Выручаюць Андрэя партызаны.

Напружанае становішча расце і расце.

Зіма. Холад. Мароз. Не прайсці, не праехаць. Цёмная ноч ляжыць над Валачаеўкай. Трывожная ноч. Злучыўшыся з часцямі Чырвонай Арміі, партызанскія атрады штурмуюць японскія ўмацаванні. Аперацыяй кіруе Андрэй. Праз калючы дрот прабіраюцца чырвоныя байцы. З аднымі вінтоўкамі ідуць яны ў бой супроць добра ўзброеных японскіх часцей. Кулямётны агонь косіць слаўных байцоў...



Кадр з фільма «Валачаеўскія дні».

— Наперад!! — каманда Андрэя.

Наперад і толькі наперад! У атаку! Вось большэвіцкі кліч і загад. Падае сцяг «японскага ўзыходзячага сонца», адступаюць імперыялісцкія збіральнікі «незабудак». Чырвонае войска вызваляе Валачаеўку, вызваляе Далёкаўсходні край ад японскіх полчышчаў. Са злобай у сэрцы пакідае Усіжыма савецкі Усход.

Народ святкуе перамогу. Байцы, партызаны, жыхары — на вуліцах. Насустрач Андрэю ідзе Маша з наследнікам. Народ лікуе. Народ спявае...

Вось сюжэтная аснова фільма «Валачаеўскія дні».

Сцэнарысты-рэжысёры браты Васільевы, калектыў актораў з вялікім натхненнем працавалі над стварэннем гэтага выдатнага фільма савецкай кінематаграфіі.

Вобразы большэвіка Андрэя (арт. Дарохін), Машы (арт. Мяснікова), партызанаў — глыбока хвалюючыя і жыццёвыя. Андрэй — гэта бясстрашны, мужны большэвіцкі арганізатар. Ён ласкавы і добры ў народзе, лірык дома, але ён суровы і люты да ворага, да яго падкопаў.

Аўтары фільма зусім не ставілі сваёй мэтай выгадна вылучыць сярод масы аднаго героя. Яны імкнуліся паказаць масу, народ, які гераічна змагаецца за сваю сацыялістычную бацькаўшчыну, які бясстрашна перамагае японскіх акупантаў. Гэта мэта дасягнута. Народ паказан смелым і рашучым. Народ ад мала да вяліка ненавідзіць імперыялісцкіх акупантаў, грознай сілай падымаецца супроць іх. Але гэта сіла патрабуе кіраўніцтва, кіраўніцтва правільнага, мудрага і простага. Такім кіраўніком з'яўляецца большэвік Андрэй. Народ верыць большэвіку Андрэю.

Дасканала выконвае арт. Свердлін ролю палкоўніка Усіжымы. Адзін погляд Усіжымы выкрывае яго, як каварнага і хітрага ворага. Палкоўнік хваліць рускі народ, яго культуру, але разам з тым тоіць у сабе глыбокую нянавісць да іх. Ён хітры, але гэту хітрасць не цяжка выкрыць. Яна неяк выпірае вонкава. У гледача вобраз Усіжымы выклікае нянавісць, лютасць.

Асобна трэба сказаць аб кампазіцыі. Перад вачыма гледача праходзіць эпізод за эпізодам. Змантажыраваны яны крыху рыхлавата. Суцэльнасць і звязанасць надаюць фільму толькі пасобныя дэталі. Напрыклад, такая дэталь, як партсігар, фактычна з'яўляецца адзінай ніткай, якая працягваецца праз увесь фільм. Недастатковая сувязь усіх частак, таннасць і знадворны эфект некаторых момантаў — асноўныя недахопы фільма. Але пры ўсіх гэтых недахопах станоўчыя бакі застаюцца неацанімымі.

«Валачаеўскія дні» — фільм, які надзвычай праўдзіва, хвалюючa перадае гледачу падзеі геройчнай барацьбы народаў нашай радзімы за сваё вызваленне. Ён увасканшае геройчнае мінулае.

«Валачаеўскія дні» — фільм, які вучыць любіць нашу сацыялістычную бацькаўшчыну, вучыць пазнаваць, ненавідзець і знішчаць ворагаў народа.

«Валачаеўскія дні» — фільм аб гераізме, мужнасці і доблесці нашай роднай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая непрыступнай крэпасцю стаіць на варце міру. Гэты фільм — выдатны падарунак XX гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

М. КАЛАЧЫНСКІ.

Міх. Ларчанка

Да пытання аб гісторы старажытнай і пачатку новай беларускай літаратуры

I.

У святле заўваг таварышоў Сталіна, Кірава і Жданава аб канспекце новай гісторыі, а таксама ў святле новага падручніка па гісторыі народаў СССР пад рэдакцыяй праф. А. В. Шэстакова пытанні беларускай старажытнай і новай (XIX стагоддзя) літаратуры ў многім праясніліся і паўстаюць перад намі ў выглядзе неадкладнай задачы навуковай распрацоўкі і дэталёвага вывучэння.

Беларускія нацыянал-фашысты, прадажныя псы нямецка-польскага фашызма ў сваёй бруднай контррэвалюцыйнай пісаніне скажалі шматвяковую гісторыю беларускага народа. Яны нахабна выступалі супроць нашага народа. Яны стварылі легенду «залатога веку», — фашысцкую тэорыю, мэтай якой была падрыхтоўка ідэалагічнай глебы для адрыву Савецкай Беларусі ад Савецкага Саюза і далучэння яе да белапанскай Польшчы.

Але гістарычныя факты жыцця беларускага народа і яго літаратурная творчасць разбіваюць нацыянал-фашысцкіх і трацкісцкіх фальсіфікатараў. Уся шматвяковая гістарычная сапраўднасць красамоўна гаворыць аб тым, што тры вялікія народы, узнікшыя з славянскага племя, — рускія, украінцы і беларусы на працягу доўгіх вякоў былі спаяны кроўнымі сувязямі дружбы і разам вялі барацьбу супроць сваіх спрадвечных ворагаў — польска-літоўскіх князёў, памешчыкаў, нямецкіх рыцараў і іншых захватчыкаў.

Калі літоўска-польскія князі і паны ў XIII—XIV стагоддзях захапілі беларускія і часткова украінскія і рускія землі, здзек іх з свабодалюбівых народаў быў вельмі вялікім. У падручніку гісторыі СССР пад рэдакцыяй Шэстакова аб гэтым моманце сказана так: «Цяжка жылося украінцам, беларусам і рускім пад уладаю сваіх князёў і баяр. Але цяжэй стала іх жыццё пад уладай польскіх і літоўскіх захватчыкаў, якія зрабілі ўсіх сялян прыгоннымі».

Польска-літоўскія паны і магнаты здзекваліся з беларускага і украінскага народаў, з іх звычаяў і жыцця; яны прымушалі іх мяняць праваслаўную грэчаскую веру на каталіцкую. Народ у гэты час паўставаў супроць здзекаў польска-літоўскіх князёў і паноў, забіваў і праганяў іх са сваіх родных земляў. Каварныя і крывадушныя польскія паны не раз імкнуліся заняволіць вялікі рускі народ, але ім гэта не ўдавалася. Рускі народ у 1612 годзе разграміў польскіх паноў і выгнаў іх з свайго вялікага Маскоўскага княжаства. Беларускі і украінскі народы ў гэтай барацьбе дапамагалі рускаму народу, а рускі народ у сваю чаргу дапамагаў вызваленню нашых народаў. Гэта геройчная барацьба нашых народаў, шчыльна звязаных кроўнай дружбай, адлюстравана не толькі ў вуснай народнай творчасці, дзе яна выступае асабліва ярка, але і ў помніках пісьмовай літаратуры.

II.

Акадэмік А. С. Орлоў у прадмове да сваіх лекцый «Старажытная руская літаратура XI—XVI стагоддзяў» правільна ўказвае на самастойнае значэнне вывучэння старажытнай беларускай і украінскай літаратуры, якія, знаходзячыся ў залежнасці і шчыльнай узаемасувязі з рускай старажытнай літаратурай, «узбагацілі і ажывілі» апошнюю. А калі так, дык патрэбна сур'ёзна і стала заняцца вывучэннем беларускай старажытнай літаратуры, якая намі не вывучалася, а нацыянал-фашыстамі ў сваіх контррэвалюцыйных мэтах нахабна фальсіфікавалася.

Мы адкідваем легенду «залатога веку», як неадпавядаючую сапраўднасці, скажаючую гісторыю. Гістарычная сапраўднасць паказвае, што беларускі народ у XIII—XIV стагоддзях і аж да сярэдзіны XVIII стагоддзя знаходзіўся пад прыгнётам літоўска-польскіх князёў і паноў. Ніякага росквіту беларускай культуры і літаратуры ў той змрочны час не было і не магло быць— аж да Вялікай сацыялістычнай рэвалюцыі, у выніку якой беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць і беларуская сацыялістычная культура дасягнула свайго нябачанага росквіту.

Аднак, у той час жыў прыгнечаны народ, жыла яго мова. Энгельс у рабоце «Якая справа рабочаму класу да Польшчы?» указаў, што ўжо ў XIV стагоддзі «на поўдні і на ўсходзе цяперашняга польскага каралеўства знаходзіліся беларусы, якія гавораць на мове, сярэдняй між польскай і рускай, але больш блізкай да апошняй». Гэтае выказванне Энгельса для гісторыі нашай літаратуры мае вялікае значэнне; яно паказвае, што ўжо ў XIV стагоддзі беларускі народ гаварыў на сваёй мове, якая вельмі блізка стаяла да рускай мовы. Вось на гэтай, блізкай да рускай, мове беларускі народ у той час ствараў сваю вусную народную творчасць, у якой пратэставаў супроць сваіх прыгнятальнікаў.

Літоўска-польскія прыгнятальнікі з мэтай прыгнечання беларускага народа ў той час цікавіліся яго мовай. Так, літоўскія князі і магнаты ў XVI стагоддзі выдавалі свае прыгонніцкія статуты 1529, 1566 і 1588 года галоўным чынам на тагочаснай беларускай мове. На гэтай-жа мове яны пісалі свае летапісы пра Вітоўта, Скіргайлу, Ягайлу, Сігізмунда. Польскія князі і спольшчаныя беларускія магнаты ў XVI стагоддзі— Радзівілы, Халкевічы, Сапегі і інш., перайшоўшы на бок каталіцтва, змагаліся супроць праваслаўнай грэчаскай веры; яны здзекваліся з звычаяў беларускага народа; яны прапаведвалі каталіцтва, мелі такіх сваіх спецыяльных прапаведнікаў, як Лаўрэнцій Крышынскі, Сымон Будны, Марцін Чаховіч. Калі Радзівілы ў сярэдзіне XVI стагоддзя прынялі каталіцкую веру, дык зноў з'яўляюцца такія прапаведнікі каталіцтва, як Скарга, які зноў-жа піша свае настаўленні на беларускай мове.

Вядома, што прыняцце князем Уладзімірам у 988 годзе хрысціянства, праваслаўна-грэчаскай веры, было ў параўнанні з язычаствам прагрэсіўным момантам у развіцці Расіі, таму што разам з грэчаскай верай сярод славян распаўсюджвалася грэчаская культура і адукаванасць.

Вынікам гэтага распаўсюджання грэчаскай культуры і адукаванасці на Русі з'явіліся спачатку перакладныя візантыйскія кнігі — Біблія, а потым і арыгінальная літаратура (летапісы, пасланні і інш.). У развіцці беларускай старажытнай літаратуры мы можам наглядаць арганічную сувязь яе перш за ўсё з рускай старажытнай літаратурай. Тое, што было створана беларускім народам да XIII—XIV стагоддзяў у шчыльным яднанні з рускім народам, не магло бясследна знікнуць. Кроўная творчая сувязь рускага і беларускага народаў прадаўжалася і ў той час, калі беларускімі землямі заўладалі Літва і Польшча. Аб гэтым сведчыць вусная народная творчасць нашага народа.

На Беларусі ў гэты-ж час з'яўляюцца асветнікі, паслядоўныя прапаведнікі грэчаскай веры, якія, перакладаючы на царкоўна-славянскую і часткай на тагочасную народную беларускую мовы візантыйскія кнігі, імкнуліся такім чынам адукоўваць народ. Першым такім прапаведнікам на Беларусі ў пачатку XVI стагоддзя быў самы адукаваны чалавек таго часу «доктар Скарына з горада Полацка». Ён пераклаў і надрукаваў у сваёй друкарні шмат кніг Біблії: Псалтыр, Іова, Прытчы, кнігу Ісуса, сына Сірахава — у 1517 годзе; Эклізіяст, Песню Песняў, Прамудрасць Саламона, кнігу Царстваў Ісуса Навіна — у 1518 годзе; а таксама Юдзіф, кнігу Судзей, Руф, Есфір, Плач Ірэміі і інш. Усе гэтыя перакладныя кнігі мае і руская старажытная літаратура.

Якое значэнне мелі гэтыя перакладныя кнігі? Акад. А. С. Орлоў у сваіх лекцыях «Старажытная руская літаратура» перадае думку самога Скарыны на гэты конт, якая выказана ім у яго прадмове да «Біблії рускай». У гэтай прадмове гаворыцца наступнае:

«Вось перад табой біблія, якая складаецца з розных частак, што даюць пазнанне ўсіх сямі навук. Калі ты хочаш ведаць гістарычныя кнігі «Аб ваенных і багатырскіх справах», чытай кнігі Судзей ці Макавейскія, якія праўдзівей за аповесці аб Александры Македонскім і Троі. Калі хочаш ведаць, летапісец, за шмат тысяч год — чытай кнігі Параліпамена. Калі хочаш ведаць маральную філасофію, — вось Прытчы Саламона, якія навучаць і рыторыцы «еже есть красномовность». «Восхощешь ли учитися музыки, то есть певницы, премножество стихов и песней святых по всей книзе сей знойдеши» (перш за ўсё, зразумела, «Песня Песняў» і «Псалтыр»). «Іншымі словамі, — каментуе акад. Орлоў, — выдавец Біблії (Скарына) хацеў сказаць: калі ты возьмеш біблію, дык знойдзеш мноства жанраў — і гістарычны жанр, і філасофскі, і найчысцейшую лірыку, як «Песня Песняў», і проста геройчныя карціны ў Макавеях. Уявіце сабе рускага кніжніка, які атрымаў такі зборнік мастацкіх узораў. Вядома, ён мог-бы абраць тут любы матэрыял для пераймання. А што Біблію пераймалі, гэта лёгка давесці».

З гэтага мы можам бачыць, што самі па сабе пераклады Скарыны мелі і мастацкае значэнне, калі ўлічыць, што ў многіх з іх перакладчык карыстаўся жывой тагочаснай беларускай мовай. Безумоўна, усё гэта патрабуе свайго вывучэння і даследвання. Нам не трэба ідэалізаваць Скарыну, ператвараць яго ў «бацьку беларускасці», як гэта рабілі нацыянал-фашысты, — нам трэба ўстанавіць яго сапраўднае гістарычнае значэнне ў старажытнай беларускай літаратуры, як прапаведніка асветы і літаратурнай кніжнай культуры, а ў гэтых адносінах Скарына, безумоўна, мае прагрэсіўнае значэнне.

III.

У XVI стагоддзі, калі асабліва моцным быў прыгнёт беларускага народа літоўска-польскімі князямі і панамі, вялася вялікая барацьба паміж праваслаўнай грэчаскай верай і верай рымскай, каталіцкай, якой трымаліся польска-літоўскія захватчыкі. Гэтая барацьба праваслаўных супроць каталіцызма, узнікшая на чыста рэлігійнай глебе, з'яўлялася формай нацыянальнай барацьбы народа за сваю незалежнасць, бо барацьба была накіравана супроць польска-літоўскіх князёў, якія хацелі сілком навязаць беларускаму народу свае парадкі і звычаі.

Вось чаму ўзнікшая ў гэты час палемічная пісьмовая літаратура, у якой беларускія манахі змагаліся супроць каталіцтва, з'яўлялася ў пэўнай меры прагрэсіўнай. Гэта літаратура цікава нам галоўным чынам таму, што ў ёй моцна адчуваецца прысутнасць народнай беларускай мовы. Цікавымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца пасланні манаха Арцемія, у якіх ён выступаў супроць католіка Пятра Скаргі і кальвініста Сымона Буднага. Апрача гэтага, ёсць асобныя зборнікі, складзеныя ў Супральскім манастыры ў 1580 годзе, у якіх таксама змешчаны прамовы, накіраваныя супроць лютэранства («Списания против люторов»). У гэтым-жа зборніку змешчаны палемічныя артыкулы на старажытнай беларускай мове, накіраваныя супроць латынян («Писания и послания от седмй собор собрано к жестоким латином» і інш.). Такіх зборнікаў ёсць некалькі.

Ёсць некалькі зборнікаў палемічнай літаратуры, звязанай з падрыхтоўкай царкоўнай уніі 1596 года. Праўда, уся гэта пісьмовая літаратура мастацкага значэння не мае, але ілюструе развіццё кніжнай культуры і беларускай мовы, а таксама сувязі гэтага развіцця з рускай культурай і мовай. Значна большае значэнне ў старажытнай беларускай літаратуры маюць пераклады — часткай на славянскую, а часткай на беларускую мову — «жыція» і апокрыфаў, а таксама свецкія аповесці, хронікі, хранографы, якія арганічна звязаны перш за ўсё з рускай старажытнай літаратурай такога-ж роду. Аднак, беларускія пераклады адрозніваюцца тым, што разам з царкоўна-славянскай мовай яны напісаны і на народнай мове.

Можна назваць у старажытнай беларускай літаратуры шмат перакладных твораў, якія па свайму зместу і функцыі аднолькавыя з рускімі. Такім чынам з перакладных твораў беларускай старажытнай літаратуры трэба назваць «Пралог» (1512 год), «Чэцьі-Мінеі», «Жыціе святога Аляксея, чалавека божага», «Жыція Барыса і Глеба», узятыя з старажытна-рускіх арыгіналаў. У гісторыі нашай літаратуры ёсць апокрыф «Аб дванаццаці муках», які з'яўляецца пераймaннем вядомага апокрыфа рускай пісьменнасці XII стагоддзя «Хаджэнне Багародзіцы па муках». Таксама ў беларускай пісьмовай літаратуры ёсць пераклады такіх свецкіх аповесцей, як аповесці аб Троі, аб Александрыі, аб Трыстане і Ізольдзе, аб Атыле, Бове, Таўдале, аб Александру Македонскім і інш.

(ПРАЦЯГ БУДЗЕ).

РАБОТНІКІ МАСТАЦТВА ДА ВЯЛІКАЙ ДАТЫ

ДА СЛАЎНАГА ЮБІЛЕЮ

У адказ на зварот трох ордэнаносных тэатраў Масквы аб падрыхтоўцы да XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота калектыў Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР праводзіць наступныя мерапрыемствы:

Рыхтуецца спецыяльны канцэрт, прысвечаны Чырвонай Арміі. У рэпертуары спэна з п'есы «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага, «Як гартавалася сталь» па Н. Астроўскаму, творы Маякоўскага і інш.

Наладжваецца работа па кансультацыі мастацкай самадзейнасці Ваеннага вучылішча імя Калініна. Рэжысёры тэатра тт. Блетніцкі, Трэпель, Штэйнбах, артысты тт. Сонкнін, Олендэр, артыст аркестра т. Юшкевіч прымацаваны да вучылішча для дапамогі драматычнаму, харэаграфічнаму і музычнаму гурткам.

У дні святкавання тэатр арганізуе два выезды ў падшэфную часць з дакладам аб рабоце тэатра і з канцэртамі.

Тэатр па дамоўленасці з Домам Чырвонай Арміі арганізуе два шэфскія спектаклі для гарнізона гор. Менска.

Унутры тэатра разгортваецца работа па вывучэнню ваеннай справы.

КАГАН. ГУРЭВІЧ.

КАШТОЎНЫ ПАДАРУНАК

Калектыў Дзяржаўнай беларускай кансерваторыі шчыльна звязаны з сваёй падшэфнай часцю і часцямі Менскага гарнізона. На працягу 1937 года Кансерваторыя арганізавала 20 канцэртных брыгад, якія далі ў часцях Чырвонай Арміі і пагранвойск рад канцэртаў. Асабліва паспяхова прайшла творчая справаздача класа праф. Залатарова перад камандзірамі і байцамі Менскага гарнізона.

За добрую пастаноўку ваенна-шэфскай работы Кансерваторыя атрымала грамату ад ЦК саюза работнікаў мастацтваў СССР.

Рыхтуючыся да 20-й гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, Кансерваторыя наладжвае з 15 лютага 9 канцэртаў для часцей Чырвонай Арміі. Група студэнтаў і педагогаў выязджае ў чырвонаармейскія часці для кансультацыі гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Калектыў Кансерваторыі вядзе вялікую абаронную работу. З 400 студэнтаў — 200 маюць значкі «Варашылаўскага стралка» першай ступені і 25 — другой ступені, 5 чалавек, у тым ліку дзве жанчыны, маюць званне майстроў дробнакаліберпай зброі. 250 студэнтаў здалі нормы на значок ППХА, 45 — на значок ГПА. Толькі гэтымі днямі калектыў Кансерваторыі заняў першае месца на ўсесаюзных завочных стралковых спаборніцтвах 29-ці музычных устаноў. Студэнты Кулееў і Бальшакоў у стральбе на 50 метраў выбілі па 96 ачкоў з 100 магчымых, студэнт Васільчанка ў стральбе на 25 метраў выбіў 50 ачкоў з 50 магчымых, студэнты Шаес і Сяткевіч — па 49 ачкоў.

Гэта — каштоўны падарунак Чырвонай Арміі да яе 20-й гадавіны.

Першыя шэфскія канцэрты Тэатра оперы і балета

Калектыў Дзяржаўнага беларускага тэатра оперы і балета рыхтуецца да ажыццяўлення сваіх абавязацельстваў, узятых ім у адказ на адозву трох ордэнаносных тэатраў Масквы. Артысты тэатра і тры канцэртмейстары працуюць над спецыяльным рэпертуарам, прысвечаным Чырвонай Арміі. Салісты тэатра рыхтуюцца да сваіх творчых справаздач. Заслужаная артыстка рэспублікі Л. Александроўская дасць у часцях Чырвонай Арміі тры справаздачных канцэрты. З творчымі справаздачамі выступяць таксама салісты Малькова і Каліноўскі, Хумарова і Кузнец, Балоцін і Дзянісаў, Аляксеева і Мурамцаў. Рыхтуецца вялікі канцэрт балетнага цэха. Два канцэрты дасць хор тэатра. Апрача таго, хор дасць яшчэ два канцэрты разам з аркестрам.

Ужо сфармавана 9 канцэртных брыгад у складзе каля 70 чалавек. Адна з гэтых брыгад, якая выехала ў раёны, 4 лютага дала для часцей Чырвонай Арміі свой першы шэфскі канцэрт. У рэпертуары брыгад—арыі з опер і песні совецкіх кампазітараў, у тым ліку песні аб Сталіне, Варашылаве, песні Чырвонай Арміі і аб Чырвонай Арміі, песні народаў братніх рэспублік—украінскія, грузінскія, армянскія, цюркскія, песні народнага фронта Іспаніі і г. д.

Тры канцэрты для часцей Чырвонай Арміі тэатр ужо даў у Менску. Канцэрты прайшлі з вялікім поспехам. Напярэдадні 20-й гадавіны тэатр наладжвае сустрэчу са сваёй падшэфнай часцю.

Дзве брыгады ў бліжэйшы час выязджаюць у аддалёныя раёны БССР.

У дваццатых лічбах лютага тэатр пазнаёміць чырвонаармейскую аудыторыю з лібрэта, музыкай і першым актам новай беларускай оперы «Міхась Падгорны» (музыка Цікоцкага).

У сувязі з гадавінай Чырвонай Арміі тэатр арганізуе агітбрыгаду для абслугоўвання рабочых у пасёлках і буйных інтэрнатах.

Два работнікі тэатра—Дзянісаў і Балоцін—кіруюць гурткамі чырвонаармейскай самадзейнасці.

С. Ф.

РАДЫЁ—ДА 20-й ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Гераічнае 20-годдзе Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі з'яўляецца невычарпальнай крыніцай натхнення мастакоў усіх відаў. За 20 год у краіне соцыялізма накоплена велізарнае багацце мастацкіх твораў аб Чырвонай Арміі, у якіх з вялікай сілай адлюстравана любоў працоўнага народа да Чырвонай Арміі — першай у свеце арміі непераможнай пролетарскай рэвалюцыі.

У праграму перадач Беларускага радыёкамітэта, прысвечаную 20-й гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, уключана вельмі нязначная частка гэтых багаццяў. Тым не менш, трэба сказаць, што праграма атрымалася яркай і разнастайнай і, бяспрэчна, абярэ да рэпрадуктараў усю шырокую аўдыторыю радыёслухачоў.

Праграма адкрываецца гутаркай — **«Сталін і Чырвоная Армія»**. Яму — правадыру народаў, арганізатару і натхніцелю непераможнай Чырвонай Арміі прысвячаюцца першыя словы, словы гарачай любві і ўдзячнасці за раданае, шчаслівае жыццё, за выхаванне лепшай ў свеце арміі, сіла якой у тым, што яна «з'яўляецца арміяй братства паміж народамі, арміяй вызвалення прыгнечаных народаў, арміяй абароны свабоды і незалежнасці народаў нашай краіны» (Сталін).

Другая гутарка прысвечана той велізарнай рабоце, якая прароблена Чырвонай Арміяй і Ваенна-Марскім Флотам за 20 год будаўніцтва соцыялізма па ўзмацненню абараназдольнасці нашай соцыялістычнай радзімы пад непасрэдным кіраўніцтвам бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна — наркома абароны Клімента Ефрэмавіча **Варашылава**.

Трэцяя гутарка раскажа аб 133 артыкуле Сталінскай Канстытуцыі, які пачынаецца словамі, начэртанымі ў сэрцы кожнага працоўнага нашай соцыялістычнай радзімы: **«Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР»**.

Сусветныя перамогі Чырвонай Арміі непарыўна звязаны з імёнамі яе герояў — выхадцаў з асяроддзя рабочых і сялян. Радыёслухачы яшчэ раз пачуюць аб цудоўным жыцці герояў грамадзянскай вайны — **Чапаева, Шчорса, Фрунзе, Лазо**, чыё імёны вечна будуць жыць у памяці народаў Совецкага Саюза. Яшчэ раз пачуюць радыёслухачы хвалюючую аповесць аб гераізме і надзвычайных баявых справах любімых маршалаў Совецкага Саюза **Варашылава, Будзённага, Блюхера**.

Нямала герояў грамадзянскай вайны знаходзіцца і ў радах часцей Беларускай ваеннай акругі. У дні радаснай гадавіны яны выступяць ля мікрафона і падзеляцца ўспамінамі аб сваім удзеле ў баях за свабоду і шчасце свайго народа.

Але бai не скончаны. Фашысты шалёна рыхтуюцца да новага перадзелу свету і чакаюць толькі зручнага выпадку, каб напасці на Совецкі Саюз. Чырвоная Армія гатова адказаць сакрушальным ударам. Ля мікрафона выступяць чырвонаармейцы, камандзіры, палітработнікі, пагранічнікі і раскажуць аб сваёй баявой вучобе, аб сваіх поспехах па ўмацаванню магутнасці Чырвонай Арміі, аб сваёй гатоўнасці ў любую мінуту адбіць напад ворага.

У дні 20-й гадавіны радыё яшчэ раз разнясе па ўсяму свету палкія радкі Джамбула аб Варашылаве, Фурманава аб Чапаеве, лепшыя ўрыўкі з твораў Паўло Тычыны—«Сабля Катоўскага», Валенціна Катаева — «Я сын працоўнага народа», Первянцова — «Качубей», Броўкі — «Праз горы і стэп», лепшыя вершы і песні аб Чырвонай Арміі Купалы, Коласа, Стальскага, Кумача, Багрыцкага, Перэца Маркіша, лепшыя творы народнай творчасці.

Беларускія совецкія пісьменнікі і паэты Купала, Колас, Лынькоў, Броўка, Глебка і інш. выступяць з чыткай сваіх твораў аб Чырвонай Арміі.

Літаратурна-музычныя мантажы «Першая конная» і «Перакоп» напомняць аб самых слаўных старонках грамадзянскай вайны — аб стварэнні ўсёсакрушальнай сілы Чырвонай Арміі — сталінскай конніцы і аб разгроме апошняга аплоту капіталізма на совецкай зямлі — врангелеўшчыны.

Радыёслухачы шырока азнаёмяцца з лепшымі вакальнымі і сімфанічнымі творамі аб Чырвонай Арміі, з дасягненнямі чырвонаармейскай самадзейнасці, з новымі і старымі песнямі аб грамадзянскай вайне, з новымі творамі аб Чырвонай Арміі беларускіх кампазітараў.

Спецыяльныя перадачы арганізуюцца для дзяцей: гутаркі аб маршалах Совецкага Саюза, чытка ўрыўкаў з літаратурных твораў аб Будзённым («Сон» Катаева), аб Чапаеве, аб Шчорсе, песні і вершы совецкіх паэтаў і кампазітараў аб Чырвонай Арміі і г. д.

20-я гадавіна Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — вялікае, радаснае ўсенароднае свята. Багатая і разнастайная праграма перадач Белрадыёкамітэта зробіць гэта свята больш радасным і змястоўным.

Р. БАРЫСАЎ.

„НАША ЗБРОЯ“

(Прэм'ера Дзяржаўнага дзіцячага тэатра БССР)



«Наша зброя» А. Крона ў пастаноўцы Дзіцячага тэатра БССР. На здымку: сцэна з апошняга акта. Злева направа: арт. Л. Буцько ў ролі Кіма, арт. А. Якуцік у ролі Сярогіна, арт. Л. Фрыдман у ролі Лазіцкага (дыверсанта).

Фота І. Каплінскага.

П'еса А. Крона для дзіцячага тэатра — «Наша зброя», напісаная ім як працяг «Вінтоўкі № 492.115» — твор невысокага мастацкага майстэрства. Не адчуваецца ў ёй яркай і багатай думкі. Няма ў п'есе і навізны падыходу да хвалюючай тэмы аб совецкім патрыятызме і гераізме совецкага народа. Усё тут адбываецца «вельмі проста», як гаворыць адзін з персанажаў п'есы Фелікс Эйно. Тым не менш, аўтару ўдалося адлюстраваць героіку совецкай сапраўднасці, маральна-палітычнае адзінства нашага народа, гатоўнасць народа — ад мала да вяліка — абараняць граніцы соцыялістычнай радзімы ад нападу ворагаў.

Героіка і самаафярнасць пагранічнікаў Косава і Белкіна, лейтэнанта Іванова, мужнасць, вынаходлівасць і інтэрнацыянальная дружба нашай дзетвары — поўняць сэрцы нашага гледача пачуццямі гордасці і любві да радзімы.

Героі «Вінтоўкі» паўстаюць у «Нашай зброі» ў новай якасці. Камроты Аўгуст Эйно, узнагароджаны за заслугі перад радзімай, камандуе зараз палком на Далёкаўсходняй граніцы. Былы кампалка Благіх па старасці год пайшоў у адстаўку, але і цяпер дыхае поўнымі грудзьмі баявым паветрам граніцы. Чацвёра былых беспрытульных, якія перавыхаваны ў роце Эйно, сталі карыснымі грамадзянамі нашай краіны і актыўнымі будаўнікамі соцыялізма.

А жулік і крымінальны бандыт Лазіцкі, па мянушцы «Герцаг», які ўзначальваў шайку беспрытульных злодзеяў, заядлы вораг народа, стаў матёрым шпіёнам і дыверсантам — агентам японскай контрразведкі.

Найбольш цікавыя вобразы, якія стварыў Крон у «Нашай зброі», — гэта піонер Фелікс, сын Эйно, і іспанская дзяўчынка Інэс — дачка забітага мадрыдскага пролетарыя.

«Наша зброя» — слабы драматычны твор нават па сваёй архітэктоніцы. У ім шмат выпадковага. Ад'ютант Эйно — Белкін — па дарозе на вакзал выпадкова наскочыў на дыверсійную банду Лазіцкага і быў ім паранены. Ехаўшыя да Эйно ў госці былыя беспрытульныя выпадкова знайшлі ў лесе параненага і пагналіся за бандай. Па «шчасліваму выпадку» дыверсант Лазіцкі нікога не застаў у кватэры Эйно, апрача жанчыны і двух дзяцей. Цэлы ланцуг выпадковасцей. Але «выпадкі» не могуць стаць сюжэтнай асновай сур'ёзнай п'есы. Рад герояў у «Нашай зброі» трафарэтныя і сантыментальна-салодзенькія. Іх мова, апрача Інэс, пазбаўлена нюансаў і якіх-бы там ні было эмацыянальных адценняў. Шмат павярхоўнай агітацыйнасці. Батальныя сцэны аднолькавай сітуацыі, без патрэбы расцягнуты і займаюць палову п'есы. Сцэна з дыверсантам Лазіцкім у хаце Эйно надуманая і наіўная. Лёгкадумная рызыка неўласціва вышкаленым шпіёнам фашысцкіх контрразведак. Лазіцкі — больш люты і подлы вораг, чым ён паказаны ў «Нашай зброі». Банальная і канцоўка п'есы са звычайнай традыцыйнай закускай і тостамі.

Выбар гэтай п'есы дзіцячым тэатрам нельга прызнаць удалым, тым больш, што незнаёмства гледача з «Вінтоўкай» робіць незразумелым рад сітуацый у «Нашай зброі».

Пры ўсіх сур'ёзных прынцыповых хібах п'есы спектакль «Наша зброя» ўсё-ж у нейкай меры радасная падзея ў жыцці дзіцячага тэатра. Спектакль паставіў малады рэжысёр — дэбютант Ю. Г. Палічынецкі — выхаванец Маскоўскага тэатральнага інстытута. Малады пастаноўшчык унёс у спектакль шмат цеплыні, шчырасці і юнацкага запалу. Ю. Г. Палічынецкім дасягнута ансамблевая зладжанасць, мастацкае ўзаемадачыненне паміж партнёрамі. Няма ў спектаклі навязчывых, непрадуманых мізансцэн. Усе яны зроблены проста, з пачуццём мастацкага такту. Нават батальныя сцэны зроблены з належнай мастацкай чуласцю.

Усе кампаненты спектакля — мастацкае афармленне, музыка, ігра акцёраў арганічна злітны. Дзівосны лясны пейзаж — узгор'і, нізіны і лясны гушчар, ілюзія імклівага руху аўтамабіля са свецячыміся фарамі, рэалізм батальных сцэн, прастата і ўтульнасць кватэры Эйно — радуюць зрок і сведчаць аб глыбокім тэатральным тэмпераменце мастака Елісеева.

Радуе і музыка Цікоцкага — меладычнасцю, мяккай і культурнай аркестроўкай. Цікоцкі стаў арганічным тэатральным кампазітарам, які добра адчувае месца музыкі ў спектаклі. Яго музыка да «Нашай зброі» і ў прыватнасці песня пагранічнікаў эмацыянальным лірычным патокам уліваецца ў спектакль, узмацняючы цёплыя рамантычныя фарбы.

Больш за ўсё радуе ў гэтай першай рабоце маладога рэжысёра — глыбокае і любоўнае ўскрыццё падтэкстаў, імкненне псіхалагічна апраўдаць кожны ўчынак актора, эмацыянальна напоўніць кожны вобраз. Зразумела, што не ўсё тут удалося Палічынецкаму. Як недасканалы літаратурны матэрыял, так і недастатковая падрыхтаванасць усіх акцёраў да такой паглыбленай работы — прычына няпоўнай удачы маладога, здольнага рэжысёра ў гэтым кірунку.

Артыстка С. Гурвіч іграе піонера Фелікса энергічным, разумным і вынаходлівым хлопчыкам. Яна дамаглася выпраўлення дэфектаў дыкцыі, уласцівых ёй у мінулых ролях. У вобразе гучаць элементы праўдзівасці перажыванняў. Але артыстка страсць часта падмяняе мітуслівасцю. Элементы ўнутранай праўды не выражаны ёю ў пластычным малюнку вобраза. Ненатуральна сагнутая постаць, раскінутыя рукі, разгублены позірк — якасці, неўласцівыя ўнутрана сабранаму Феліксу.

Радуе артыстка Басінкевіч у ролі іспанскай дзяўчынкі Інэс. Колькі дзіцячай шчырасці і цеплыні ў гэтым прывабным вобразе! Перамагаючы правінцыяльны штамп сюсюкаючага дзіцяці, уласцівы ёй у некаторых мінулых ролях, артыстка глыбока пранікае ў душу вобраза. А ў апавяданні пра Мадрыд, пра новую любімую радзіму — СССР яна дасягае сапраўднага творчага натхнення. Тут кожная рэпліка артысткі гучыць, як закончаны меладычны радок. Нестае ў ігры здольнай артысткі дастатковай рухавасці і жыццёрадаснасці, уласцівай вобразу Інэс. Сумны лірызм і задуменнасць часта падмяняюць у яе дзіцячую непасрэднасць.

Шчыра і проста, без усякага напружання іграе артыстка Заборская скромную і мужную жанчыну Тоню Марозаву — жонку палкоўніка Эйно.

У шыракаплечым, магутным, як дуб, пагранічным калгасніку Калачове артыст Бондараў увасобіў рысы народнай мудрасці і пільнасці, спакойнай упэўненасці ў сіле народа. Калачовы — надзейныя памочнікі совецкіх пагранічнікаў. Цёпла іграе артыст Матусевіч ролю старшага лейтэнанта Косава. Артыст псіхалагічна праўдзіва падкрэслівае любоўныя адносіны да сваіх выхаванцаў — былых беспрытульных, вытрымку і арыентыроўку ў баявой абстаноўцы, уменне не губляцца і спакойна пераносіць пакуты, памятаючы перш за ўсё пра абавязак байца.

Пластычна выразны малюнак палкоўніка Эйно ў выкананні артыста Чэмелава эмацыянальна не напоўнены. У ігры Чэмелава шмат фармальнага, знадворнага і нестае ўнутранай цеплыні. Ствараецца ўражанне, што артыст неяк абыякава ўспрымае многія драматычныя сітуацыі, у якія трапляе палкоўнік, і не перажывае іх. Тут у наяўнасці адсутнасць «унутранай партытуры» ролі, аб абавязковай неабходнасці якой гаворыць К. С. Станіслаўскі. Малады, культурны актор Чэмелаў павінен сур'ёзна задумацца над лёсам іграных ім ролей і зрабіць грунтоўны паварот да глыбокага псіхалагічнага раскрыцця вобраза, да ўскрыцця падтэкстаў, падводных эмацыянальных элементаў і дэталяў, якія складаюць унутраную партытуру ролі.

Элементы сухасці і абыякавасці, адсутнасць глыбокага псіхалагічнага раскрыцця вобраза ёсць у ігры Дашкоўскага, які выконвае ролю лейтэнанта Іванова, былога «Ірада». Звонку здаецца — актор робіць усё правільна, дзейнічае паводле сітуацыі, не блытае тэксту, але зноў-такі няма ніякіх нюансаў, адценняў у вобразе. Іваноў заўсёды аднолькавы. Нам думаецца, што і ў Дашкоўскага тыя-ж хібы, што і ў рабоце Чэмелава. Тэкст, праўда, тут менш удзячны, але сітуацыі затое больш выгодныя. Мы ўпэўнены, што і Дашкоўскі здольны дабіцца мастацкай праўды ў раскрыцці вобраза.

Добра іграе Фрыдман ролю дыверсанта — белабандыта Лазіцкага. Фрыдман псіхалагічна пераканаўча паказвае, як за квяцістай фразеалогіяй хаваецца найподлы вораг. Актор трымае залу ўвесь час у напружанай увазе да кожнага руху Лазіцкага. Разумнай ігрой, якая пранізана вострай думкай, актор некалькі змяншае фальш сітуацыі, у якую аўтар ставіць японскага шпіёна. Валодаючы благародным музыкальным голасам, Фрыдман не мадуліруе яго. Найбольш выразнай фарбай у інтанацыях Фрыдмана з'яўляецца трагічная фарба, але яму нехапае больш разнастайных адценняў. Гэта — дэфект, які можа быць выпраўлены.

Не пакідае ўражання ігра Мефедава ў ролі палкоўніка Благіх. Пэўны штамп добрага благароднага старога даўлее над акторам.

У выкананні эпізадычных ролей няма такіх індывідуальных рыс, на якіх можна было-б спыніцца асобна.

Спектакль «Наша зброя» востра ставіць пытанне аб павышэнні адказнасці тэатраў да якасці п'ес, якія яны ставяць.

М. МОДЭЛЬ.

ГІСТОРЫЯ З ВЫДАННЕМ АДНОЙ ДЗІЦЯЧАЙ КНІЖКІ

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі на працягу трох год марынавала выданне дзіцячай аповесці М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку». Кніга была здадзена ў 1934 годзе. Дзіцячая казка пасылалася для праверкі правільнасці паказу паходу чырвоных на Варшаву ў дзесяткі інстанцый.

У 1937 годзе казка раптоўна была выдана з незвычайнай для нашага выдавецтва раскошай: у залатым цісненні, з каляровымі малюнкамі.

Шаржы Г. ДАКАЛЬСКАЙ.



Малы быў Мішка, недалетак,
Прынёс ён кніжачку для дзетак
У ДВБ.
А там быў «дзядзя»,
Вандроўку Мішку ён наладзіў

Па правяраючых этапах.
З дзіцячай кніжкай той у лапах
Мішук хадзіў: гады ляцелі,
А ў ДВБ дуду вярцелі.



Падрос Мішук. У паўсці хрыбетнай
Сівізна добрая заметна.
Расселся ён з дарогі ў крэсле
(Над крэслам—надпіс). І тады
Яму ДэВэБаўцы прынеслі
З паклонам ніжкім тую кніжку,
Што вандравала разам з Мішкам

Аж тры гады, аж тры гады!

**

Чаму чыноўнік той убачыў,
Нарэшце, яснасць кніжкі?
Над крэслам надпіс, не іначай,
Дапамог тут крышку.

М. К.

„ВОЧНАЯ СТАЎКА“ НА КЛУБНАЙ СЦЭНЕ

Самадзейны драматычны калектыў клуба «Кастрычнік» (ст. Жлобін) падрыхтаваў і паказаў свайму гледачу пастаноўку п'есы бр. Тур і Л. Шэйніна «Вочная стаўка».

Пастаноўка п'есы самадзейным калектывам задаволіла гледача.

Асабліва ўдаліся маладому самадзейнаму калектыву сцэны: у кватэры краўца Гурэвіча, апошні допыт следчым Ларцэвым шпіёна Галкіна.

Спектакль атрымаўся яркі і свежы. Ён выклікае ў гледача пачуццё палкай любві да нашай радзімы і глыбокай нянавісці да ворагаў. Спектакль захапляе. Здаецца, што ты, глядач, разам з следчым, краўцом Гурэвічам, доктарам Руч'ёвым зрываеш маскі з заклятых ворагаў. І яны — прэзрэнныя мярзотнікі, ашалелыя фашысцкія сабакі выкрыты слаўнымі наркамунутдзельцамі пры дапамозе патрыётаў нашай радзімы—нашага народа. Спектакль пакідае добрае ўражанне ў гледача, заклікае быць пільным.

З выканаўцаў трэба адзначыць гуртоўца тав. Шчыгельскага, які стварыў яркі вобраз следчага Ларцэва, і С. Кагана, добра выканаўшага ролю краўца Гурэвіча. Справіліся з выкананнем сваіх ролей і А. Глушак (Лаўрэнка), Н. Кудрашоў (Галкін), А. Леўчанка (Вера Руч'ёва).

Л. ЛЕЎЧАНКА.

КАЛГАСНА-СОЎГАСНЫЯ ТЭАТРЫ ПАТРАБУЮЦЬ ДАПАМОГІ

Рагачоўскім калгасна-соўгасным тэатрам за год сваёй работы абслужана каля 38 тысяч гледачоў—у Рагачоўскім, Асіпавіцкім, Парыцкім, Будакашалёўскім, Чачэрскім і іншых раёнах БССР. Тэатр даў у гэтых раёнах 100 спектакляў. У рэпертуары — п'еса Біль-Белацэркоўскага «Шторм» і канцэрт на матэрыяле «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну».

Зараз тэатр працуе над пастаноўкай п'есы Л. Карасёва «Агні маяка». Да дня XX гадавіны Чырвонай Арміі будзе паказана гледачу і наступная работа—п'еса Наўрозава «Мая маці». У 1938 годзе рэпертуар тэатра, акрамя адзначаных работ, узбагаціцца п'есамі: «Не ўсё кату масленіца»—А. Н. Астроўскага, «Беспакойная старасць»—Рахманава, «Ордэн» — Троепольскага і «У пушчах Палесся»—Якуба Коласа.

Але для таго, каб калгасна-соўгасны тэатр здолеў выканаць намечаную праграму — забяспечыць творчы рост маладога калектыва і стварэнне багатага рэпертуара — тэатру патрэбна дапамога. У першую чаргу Упраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР трэба змяніць свае адносіны да калгасна-соўгасных тэатраў. Патрэбны не выпадковыя прыезды работнікаў Упраўлення і пустая пісаніна «вывадаў», а канкрэтная, штодзённая дапамога, якая-б забяспечыла творчы рост акцёраў, стварэнне належных бытавых і матэрыяльных умоў. Напрыклад, прыязджаў у наш тэатр работнік Упраўлення тав. Уханаў, пісаў «матэрыялы», але становішча ў тэатры не змянілася. Па-ранейшаму не задаволена патрабаванне тэатра аб будове гаража, аб набыцці спецвопраткі для зімніх выездаў. Да гэтага часу не вырашана пытанне аб перадачы калгасна-соўгасным тэатрам тэатральных будынкаў, якія ёсць у раёнах.

Калгасна-соўгаснымі тэатрамі ўзнята пытанне аб скліканні ўсебеларускага фестываля гэтых тэатраў. Гэта —важнейшае мерапрыемства для абмену творчым вопытам і для творчай вучобы маладых акцёраў. Упраўленню па справах мастацтваў трэба падтрымаць ініцыятыву тэатраў і забяспечыць яе ажыццяўленне ў 1938 годзе.

Калгасна-соўгасныя тэатры патрабуюць дзейснага кіраўніцтва і клапатлівай дапамогі.

І. ЯЦЭНЧУК.

Радыёкампазіцыя „Выпадак на чыгунцы“

Сын будачніка — піонер Паўлік ловіць рыбу. Да яго падыходзіць незнаёмы чалавек з вудачкамі і заводзіць з ім гутарку. Паўлік пытаецца, хто ён такі. Чалавек блытаецца, а потым пачынае распытваць Паўліка аб цягніках і аб тым, калі яны праходзяць, аб вайсковых часцях. Гэта выклікае ў Паўліка падазронасць. Вечарам Паўлік ідзе на чыгунку і бачыць расшрубаваныя рэльсы. Ён бяжыць, каб паведаміць бацьку, але ўжо знаёмы яму «рыбак» затрымлівае яго. Гэта шпіён і дыверсант, які хоча скарыстаць Паўліка як правадніка да совецкай граніцы.

Паўлік увесь час імкнецца паведаміць аб небяспецы. Вось праязджаюць пагранічнікі. Шпіён кажа Паўліку: «Толькі адзін рух і ты атрымаеш у бок фінку»... Але смелы піонер не баіцца пагроз, ён крычыць. Пагранічнікі ловяць шпіёна, а потым паведамляюць паўлікавага бацьку аб разабраных рэльсах. Чыгунка своечасова адрамантавана. Крушэнне папярэджана...

Такі кароткі змест радыёкампазіцыі «Выпадак на чыгунцы». Аўтар яе — пісьменнік А. Якімовіч.

К.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзённу. Адрас: Менск. Совецкая 68. Дом пісьменніка. Тэлефон сакратарыята 25-394, рэдактара 20-831. Уп галоўлітбела № 4153.